РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 КРАСАВІКА 2025 г. СУБОТА № 77 (30465)

# НАШЫ ВЕЧНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ



Фота БелТА.

**Хрысціянам Беларусі**
**Дарагія суайчыннікі!**

Шчыра віншую са светлым святам Вялікадня!

У гэтыя дні праслаўляюцца збавіцельны подзвіг Хрыста ў імя ўсяго чалавецтва і яго самаахвярнае служэнне людзям.

Мільёны веруючых, якія абралі галоўнымі арыенцірамі дабро і міласэрнасць, з цеплынёй у душы сустракаюць Уваскрэсенне Хрыстова. Яно нясе ў дамы шчасце, радасць і любоў.

На беларускай зямлі захавалася адданасць хрысціянскім каштоўнасцям. Тут з асаблівай ухвалявансцю ўдзячныя Госпаду за існыя мір і згоду.

Няхай вас акружаюць ўзаемаразуменне, надзея і натхненне. Жадаю вам і вашым сем'ям жыццёвай раўнавагі, моцнага здароўя і поспехаў.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**




# КНІГІ, ВЕРНУТЫЯ З ПАЛОНУ

**Пячаткі нямецкіх бібліятэк з іх выразалі. Шкада было ўнікальныя выданні, але нянавісць да фашыстаў была мацнейшая**



Унікальныя дакументы часоў Вялікай Айчыннай вайны, кнігі, якія вярнуліся на Радзіму з фашысцкай Германіі, а таксама іншыя цікавыя экспанаты і мультымедыйныя праекты прадставілі ў Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь. СТАР. 3




# ПІНСК. НА ГЕНАЦЫД І ЗВЕРСТВЫ АДКАЗАЛІ ЎСЕНАРОДНЫМ СУПРАЦІВАМ

**Першы партызанскі атрад часоў Вялікай Айчыннай вайны быў створаны ў Пінску, дзе дзёрзка дзейнічалі мясцовыя падпольшчыкі**

Першая кроў вайны пралілася ў Пінску раніцай нядзелі 22 чэрвеня 1941 года. Нямецкія самалёты скінулі некалькі бомб на тэрыторыю сударамонтнага завода. Загінуў малады рабочы Дзмітрый Паўлікоўскі, двое яго таварышаў атрымалі раненні. Тым часам немцы ўжо бамбілі самы блізкі ад Пінска аэрадром — у населеным пункце Жабчыцы. Акрамя баявых машын быў знішчаны і ваенны гарадок, у якім жылі лётчыкі, іх сем'і і абслуговы персанал. СТАР. 3



КАНТЭКСТ

# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — БЯСПЕКА І ЭКАНОМІКА

**Эксперты — аб унікальнасці інтэграцыі ў Саюзнай дзяржаве, яе далейшым удасканаленні**

Тэма паглыблення саюзнай інтэграцыі ў чацвер гучала падчас сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з намеснікам дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Сяргеем Глазьевым. Рашэннем кіраўнікоў Беларусі і Расіі ён зменіць Дзмітрыя Мезенцава на гэтай адказнай пасадзе. Па словах Прэзідэнта, ад новага дзяржсакратара, а таксама людзей, якія будуць працаваць у апараце саюзнага будаўніцтва, будзе многае залежаць. Падчас размовы кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што рух да больш цеснага беларуска-расійскага саюза павінен грунтавацца найперш на эканоміцы.



У размове з журналістамі **прэс-сакратар Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрый ПЯСКОЎ** адзначыў, што Саюзная дзяржава развіваецца, прычым развіваецца планамерна, паступальна. «Гэта самая дасканалая форма інтэграцыі на тэрыторыі былога Савецкага Саюза, — падкрэсліў ён. — Безумоўна, яна прыносіць выгаду народам дзвюх краін — народам Расіі і Беларусі. Што датычыцца кадравых змяненняў: ідзе ратацыйны працэс, гэта таксама натуральна».

Акрамя таго, Дзмітрый Пяскоў адзначыў, што Саюзная дзяржава не існуе ў вакууме, а з'яўляецца, нягледзячы на ўсе вядомыя незаконныя абмежаванні, якія былі ўведзены ў адносінах да дзвюх краін, складальнай часткай сусветнага эканамічнага працэсу. «Таму, вядома, адчувае на сабе ўплыў тых тэндэнцый, якія дамінуюць у свеце або тых турбуленцый, якія мы назіраем цяпер», — сказаў ён.



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Ірына ДАЎГАЛА** звярнула ўвагу на адзін з асноўных пасылаў кіраўніка дзяржавы падчас сустрэчы з Сяргеем Глазьевым — нам не быць і не існаваць, калі не будзе адзінай сістэмы ўзаемадзеяння. Парламентарый заўважыла, што гэта нармальна, калі на такой важнай пасадзе адбываюцца кадравыя змены. «Аднак нязменным застаецца галоўнае — развіццё саюзнай інтэграцыі, — падкрэсліла яна. — У прыярытэце і для Беларусі, і для Расіі — бяспека і эканоміка. Асабліва гэта актуальна ў непрадказальнай геапалітычнай абстаноўцы, якая пастаянна мяняецца. Развіццё Саюзнай дзяржавы ідзе інтэнсіўна. Як кажуць, не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло. Санкцыі, якія ўвялі супраць Беларусі і Расіі — гэта надоўга, а таму гэта неабходна ўлічваць як у вырашэнні пытанняў эканомікі, так і бяспекі. Кіраўнік дзяржавы не выпадкова неаднаразова звяртаў увагу на неабходнасць выпрацоўкі эканамічнага плана з апорай на ўласныя сілы. Гэта значыць, што перад нашымі краінамі стаіць задача — не толькі па пошуку, але і ўстанаўленні, а таксама развіцці эканамічных адносін з дзяржавамі, якія гатовы з намі супрацоўнічаць на роўных».

Па словах дэпутата, многае за гады інтэграцыі зроблена. «28 саюзных праграм — не мяжа, — лічыць Ірына Даўгала. — Нам жыццёва неабходна інтэнсіўна і рэзультатыўна развіваць сумесную прамысловую кааперацыю, даваць максімальную магчымасць узаемнаму развіццю тавараабароту, лагістычнай інфраструктуры, мікраэлектронікі, космасу, інфармацыйнага асяроддзя. Акрамя таго, інфармацыйная тэма мае пэўнае развіццё: да пытанняў арганізацыі саюзнага медыяхолдынга неабходна падыходзіць прадметна. Складана, калі не сказаць немагчыма, як Беларусі, так і Расіі развівацца, калі не гарантаваць бяспеку. І тут зноў — адзіныя задачы. Вядома ж, мы не можам моўчкі назіраць, як каля нашых межаў, нібы хмары, канцэнтруюцца войскі НАТА. А значыць, умацаванню ваенна-тэхнічнага партнёрства паміж Масквой і Мінскам будзе нададзена асаблівая ўвага».

Парламентарый выказала перакананасць, што запэўненні Сяргея Глазьева аб захаванні і развіцці роўных умоў гаспадарання, роўных правоў грамадзян, агульных механізмаў развіцця нашых краін толькі пацвярджаюць непахіснасць ідэй і мэт Саюзнай дзяржавы. «А мы на тое і Саюзная дзяржава, каб разам умацоўваць і абараняць свае межы», — падкрэсліла яна.

Прызначэнне Сяргея Глазьева Дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, **генеральны дырэктар Гомельскага гандлёва-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Фармацыя» Людміла САПЕГА** называе вельмі важным.



«Сяргей Глазьеў даўно і добра вядомы як мудры дзяржаўны дзеяч і дасведчаны эканаміст, — канкрэтызавала сенатар. — Ён таксама займае цвёрдую пазіцыю па ўмацаванні сяброўскіх эканамічных, палітычных, культурных і іншых сувязяў паміж нашымі народамі як у рамках Саюзнай дзяржавы, так і ў цэлым ЕАЭС. Не выпадкова на працягу сямі гадоў ён займаў пасаду дарадцы Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па каардынацыі работы федэральных органаў выканаўчай улады па гэтым напрамку. Прызначэнне на такую адказную пасаду чалавека, які мае цвёрдую палітычную пазіцыю, які валодае шырокімі эканамічнымі ведамі і не раз пацвердзіў сваё ўменне знаходзіць кампраміс па самых вострых пытаннях, дае магчымасць спадзявацца, што інтэграцыйная работа па ўмацаванні Саюзнай дзяржавы атрымае новы магутны імпульс».



**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Павел ПАПКО** адзначыў, што ўнікальнасць Саюзнай дзяржавы як інтэграцыйнага аб'яднання ў тым, што яна кансалідуе краіны, блізкія эканамічна і каштоўнасна. «25 гадоў — гэта даволі невялікі шлях для эканамічных, палітычных саюзаў, — лічыць дэпутат. — Сусветная практыка паказвае, што інтэграцыя краін патрабуе шмат часу, мноства розных працэдур узгадненняў, краінам даводзіцца пераадольваць нямала бар'ераў. Але нам удалося за кароткі па мерках гісторыі час пабудаваць моцны саюз. У першую чаргу, дзякуючы асобам двух прэзідэнтаў, іх асабістаму ўкладу ў гэтыя працэсы».

Павел Папко падкрэсліў, што Саюзная дзяржава — гэта прыклад роўнай канкурэнцыі, збалансаваных эканамічных адносін. «Беларусь — прагрэсіўная, тэхналагічна развітая краіна, мы захавалі найлепшыя навуковыя і вытворчыя школы, — канстатаваў ён. — Па многіх пазіцыях нашы расійскія партнёры зацікаўлены ў беларускіх тэхналогіях, і з выкарыстаннем расійскіх рэсурсаў мы атрымліваем якасную прадукцыю. Мы не прымакі ў гэтым саюзе. Беларусы і расіяне — раўнацэнныя паўнапраўныя партнёры, якія разам вырашаюць стратэгічныя задачы Саюзнай дзяржавы і тым самым паказваюць прыклад саюзнай інтэграцыі для ўстойлівага развіцця і паляпшэння якасці жыцця народаў дзвюх краін».

ПЯЦІЦОДКА ЯКАСЦІ

# І БАСЕЙН ПАМІЖ УРОКАМІ

**Чым прываблівае дзіцячы санаторый у Асіповіцкай Свіслачы**



У Беларусі рэалізуецца шмат дзяржаўных праграм, накіраваных на паляпшэнне сацыяльнай падтрымкі дзяцей. Асаблівая ўвага надаецца здароўю падрастаючага пакалення. Прадугледжаны дадатковыя медыцынскія агляды для ранняга выяўлення паталогій, палепшана праграма рэабілітацыі і санаторнага лячэння дзяцей з хранічнымі захворваннямі. Як гэта прымяняецца на практыцы, карэспандэнт «Звязды» паназірала на прыкладзе дзіцячага санаторыя ў аграгарадку Свіслач Асіповіцкага раёна. СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X
25077>

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby.
Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

АКТУАЛЬНА

# УВАГА ДА ДЭТАЛЯЎ

**Пытанні стварэння цэнтралізаванай інфармацыйнай сістэмы аховы здароўя і лічбавізацыі галіны разгледзелі ў Доме ўрада**

Пад старшынствам прэм'ер-міністра Аляксандра ТУРЧЫНА ўчора прайшла нарада, у цэнтры ўвагі якой было стварэнне цэнтралізаванай інфармацыйнай сістэмы аховы здароўя і лічбавізацыі галіны. Як падкрэсліў прэм'ер-міністр, неабходна стварыць такую сістэму, якая будзе карысная для аховы здароўя і грамадзян.

Ён адзначыў, што хоча ад дакладчыкаў пачуць самае галоўнае — разуменне архітэктуры сістэмы, якая выбудоўваецца, і яе выніку (якую карысць для сістэмы аховы здароўя і для грамадзян яна нясе).

— Да распрацоўкі сістэмы неабходна шырока прыцягваць экспертаў, у якіх ёсць вопыт выкарыстання падобных платформаў, — прапанаваў Аляксандр Турчын.

Па выніках нарады міністр аховы здароўя Аляксандр Хаджаеў распавёў журналістам, што навацыі выкліканы рэалізацыяй распараджэння кіраўніка дзяржавы, якое тычыцца стварэння за 2024-2025 гады інфармацыйна-медыцынскай платформы.

— Платформа павінна задавальняць патрэбы як грамадзян Рэспублікі Беларусь, так і прафесійнай супольнасці, — растлумачыў профільны міністр.

Ён паведаміў, што падчас пасяджэння прэм'ер-міністр акцэнтаваў увагу на дасягненні практычнага выніку:

— На сённяшні момант у рамках даручэнняў, якія былі сёння агучаны, мы пашырым экспертную групу за кошт асоб, якія маюць вопыт укаранення больш разнастайных медыцынскіх платформаў з вопытам іх працяглага эксплуатавання. Мы павінны сабрацца яшчэ раз і ацаніць, што неабходна, каб якасна выканаць распараджэнне кіраўніка дзяржавы.

Паводле яго слоў, цэнтралізаваная інфармацыйная сістэма аховы здароўя павінна быць уведзена ў эксплуатацыю да канца 2025 года. Аляксандр Хаджаеў дадаў, што 2024 год быў прысвечаны ўкараненню першаснага этапу ў рамках эксперыменту ў дзевяці арганізацыях краіны:

— Мы — Міністэрства аховы здароўя — у канцы 2024 года прынялі яго як заказчыкі і цяпер павінны імплементаваць у 467 арганізацый сістэмы аховы здароўя. Але разам з тым на кожным этапе мы павінны рабіць рэвізію. Менавіта гэтым у самыя кароткія тэрміны мы зоймемся і да 1 чэрвеня зробім даведачную інфармацыю з аналізам і прапановамі па ўдасканаленні выканання дадзенага даручэння.

ЭКАНОМІКС

# КАНТРОЛЬ НА КОЖНЫМ ЭТАПЕ

**Цэнавая сітуацыя на спажывецкім рынку застаецца кіраванай і стабільнай**

Па даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта па выніку сакавіка 2025 года прырост індэкса спажывецкіх цэн склаў у гадавым выражэнні 5,9 % (за аналагічны перыяд мінулага года — 5,6 %).



Як растлумачылі ў МАРГ, да асноўных прычын росту цэн у першым квартале 2025 года можна аднесці некалькі фактараў, сярод якіх такія, як павышэнне цэн імпарту на фоне высокай інфляцыі ў Расійскай Федэрацыі, павелічэнне сусветных цэн на асобныя харчовыя тавары; змяненне геаграфіі імпарту па асобных таварах; павышэнне ў рамках дзеючага заканадаўства адпускных цэн вытворцамі; сезоннае павышэнне цэн на гародніну і яблыкі, прадугледжанае пры ўвядзенні гранічных адпускных і рознічных цэн (дадаткі 11 і 12 пастановы Саўміна № 713) і некаторае паслабленне цэнавага рэгулявання.

Дарэчы, што датычыцца павелічэння сусветных цэн на асобныя харчовыя тавары, то па даных Сусветнага банка, прырост сярэдніх цэн на сусветным рынку на каву гатунку арабіка склаў 93,7 %, на каву гатунку рабуста — 55,6 %; прырост сярэдніх сусветных цэн на какава-бабы з кастрычніка 2024-га па студзень 2025 года склаў 64,7 %.

У частцы рэалізацыі пастановы Саўміна № 713 «Аб сістэме рэгулявання цэн» вытворца мае права без узгаднення з дзяржаўным органам (арганізацыяй) штомесяц павышаць цану не больш, чым на 0,3 %. Пры гэтым, калі вытворца не карыстаўся гэтым правам, напрыклад, у 2024 годзе, то ў студзені 2025-га меў магчымасць павысіць цану адразу за ўвесь папярэдні перыяд, растлумачылі ў профільным міністэрстве.

— Разам з тым, цэнавая сітуацыя на спажывецкім рынку застаецца кіраванай і стабільнай, — падкрэслілі ў МАРГ.

МІЖПАРЛАМЕНЦКАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

# КАНСАЛІДАЦЫЯ НАМАГАННЯЎ ПА ЗАХАВАННІ ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАЎДЫ І КАШТОЎНАСЦЬ МІРУ

**Акцэнты выступлення Наталлі КАЧАНАВАЙ на ўрачыстым пасяджэнні МПА СНД, прысвечаным 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне**

Мерапрыемствам другога дня Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД папярэднічала ўрачыстая цырымонія ўскладання кветак і вянкоў на Піскароўскіх мемарыяльных могілках. Нагадаем, у Пецярбургу на МПА СНД працавала парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай.



Фота ТГ-канала Савета Рэспублікі.

## «ДУХ НАРОДА-ПЕРАМОЖЦЫ — У КОЖНЫМ З НАС»

Выступаючы на ўрачыстым пасяджэнні Міжпарламенцкай Асамблеі, прысвечаным юбілею Вялікай Перамогі, Наталля Качанава звярнула ўвагу, што зусім няшмат часу застаецца да асабліва важнай і знакавай даты, якая восем дзесяцігоддзяў таму з'явілася заканамерным трыумфам справядлівасці, падарыла доўгачаканую надзею на мірную будучыню. Па словах спікера, памяць аб Вялікай Перамозе непадуладная часу. «Яна стала сімвалам адзінства і згуртаванасці шматнацыянальнага савецкага народа, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Скрэпай, якая звязала нашы брацкія краіны ў адзіны генетычны вузел. Яго разарваць не дазволіць дух народа-пераможцы, які — у кожным з нас».

Спікер канстатавала, што Беларусь — жывы помнік той страшнай вайне. «Наша краіна першай прыняла на сябе зруйнавальны ўдар дывізій вермахта, — канкрэтызавала яна. — Загінуў кожны трэці, тысячы разбураных і спаленых вёсак назаўжды зніклі з зямлі. Беларускі народ проста знішчалі ў лагерах смерці, доследных лабараторыях, газавых камерах, уласных дамах. Кожны сантыметр зямлі насычаны крывёй яе жыхароў і савецкіх салдат. Мы ведаем гэту горкую праўду не па падручніках. Мы выраслі з ёй. І адабраць яе нікому не дазволім».

Наталля Качанава звярнула ўвагу на небяспечныя тэндэнцыі, калі скажаюць гісторыю і ацэнкі вынікаў Другой сусветнай вайны, спрабуюць ураўноўваць у правах ахвяр і катаў, вызваліцеляў і агрэсараў, ставяць пад сумненне рашэнні міжнароднага ваеннага трыбунала. «Нам прапануюць паверыць у тое, што чорнае — гэта белае, узамен на палітычнае і фінансавае заступніцтва, — удакладніла яна. — Зносяцца помнікі і апаганьваюцца магілы герояў-вызваліцеляў. Па вуліцах вызваленай Еўропы маршыруюць неанацысты. А ў парламенце Канады легіянеру СС, які вызначыўся асаблівай жорсткасцю, апладзіруюць стоячы тыя, хто піша законы новага часу. Сучаснае пакаленне еўрапейцаў ужо не ведае, што нараджэннем яны абавязаны не толькі продкам, але і нашым воінам, якія заплацілі сваім жыццём за мір і іх светлую будучыню. Будучыню, якая так і не наступіла для больш чым трох мільёнаў беларусаў, якія загінулі ў баях, былі забітыя і закатаваныя да смерці нямецкімі акупантамі».

## «МЫ Ў СПАДЧЫНУ ПАВІННЫ ПЕРАДАЦЬ ТОЕ, ШТО ДОЎГІЯ ГАДЫ БЕРАЖЛІВА ЗАХОЎВАЛІ САМІ»

Беларусь, па словах Старшыні Савета Рэспублікі, адкрыта і паступальна прасоўвае ідэі міру і палітыку сяброўства на ўсіх міжнародных пляцоўках. «Мір — гэта не проста адсутнасць вайны, а жыццё ў бяспецы і гармоніі, — акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава. — Як падкрэсліў Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка на апошнім пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, украсці можна памяць, але не праўду: «Калі б не было гераізму савецкага народа — не было б тых дзяржаў і людзей, якія робяць усё, каб дыскрэдытаваць подзвіг савецкага народа і забраць нашу Вялікую Перамогу, якая нас так аб'ядноўвае».

Спікер канстатавала, што на парламентарыяў ускладзена асаблівая місія — умацоўваць сувязі і ўзаемаадносіны, а не ўзводзіць агароджы па перыметры нашых заходніх суседзяў. «І той факт, што летась на святочным парадзе ў гонар Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і 80-годдзя Вызвалення Беларусі ўпершыню бралі ўдзел ваенныя разлікі з краін Садружнасці і Кітая, сведчыць аб гатоўнасці сумесна абараняць агульную тэрыторыю і паветраную прастору, — падкрэсліла яна. — А гэта ўжо зона адказнасці сучаснага пакалення. Ім, маладым, будаваць новую архітэктуру бяспекі. Мы толькі ў спадчыну з рук у рукі павінны перадаць ім тое, што доўгія гады беражліва захоўвалі самі».

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на важнасць умацавання духу пераможцаў у моладзі, перадачы ўнікальнага савецкага досведу збліжэння народа з захаваннем нацыянальных інтарэсаў, агульных гістарычных дасягненняў, памяці тым, хто працягне ствараць у імя міру і дабрабыту. «Мы верым, што кансалідацыя намаганняў па захаванні гістарычнай праўды ў барацьбе супраць нацыстаў і іх памагатых будзе працягнута, што ў заходніх палітыкаў у рэшце рэшт возьме верх розум і агрэсіўную рыторыку яны зменяць на канструктыўны дыялог, — рэзюмавала Наталля Качанава. — Бо рана ці позна ўсе канфлікты і войны заканчваюцца за сталом перагавораў і заключэннем міру. І задача парламентарыяў Садружнасці — для гэтага падрыхтаваць глебу, заснаваную на справядлівасці, гуманнасці, трагічных уроках гісторыі і Вялікай Перамогі».

* * *

На палях сесіі МПА СНД Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сустрэлася са старшынёй Сената Олій Мажліса Танзілай Нарбаевай. Бакі абмеркавалі падрыхтоўку да III Беларуска-Узбекскага жаночага бізнес-форуму, які хутка пройдзе ў Віцебску, а таксама шляхі ўмацавання міжпарламенцкага, рэгіянальнага і маладзёжнага супрацоўніцтва.

Наталля Качанава адзначыла важнасць гэтай двухбаковай сустрэчы напярэдадні 80-годдзя Вялікай Перамогі: «Мы разам удзельнічалі ва ўрачыстым пасяджэнні, разам абмяркоўвалі актуальныя пытанні парадку дня. Усё гэта вярнула нас у тыя гады, калі ўсе мы былі ў Савецкім Саюзе, калі мы былі адзіным народам. Але нас нішто не падзяліла, мы і сёння разам».

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што паміж Беларуссю і Узбекістанам складваюцца добрыя адносіны. «Мы зробім усё для таго, каб дамоўленасці, дасягнутыя кіраўнікамі нашых дзяржаў, былі выкананы», — сказала Наталля Качанава.

«Мы актыўна рыхтуемся да правядзення III Беларуска-Узбекскага жаночага бізнес-форуму, каб паказаць вам нашы рэгіёны, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі. Сёлета мы прыўносім у форум вельмі важны напрамак — гэта супрацоўніцтва паміж нашымі дэпутацкімі структурамі, якія працуюць непасрэдна з людзьмі. Мы пакажам, падзелімся досведам. Супрацоўніцтву органаў мясцовага самакіравання неабходна надаць імпульс».

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

НА КАНТРОЛІ

# ДАКЛАДНАЕ ЗЕМЛЯРОБСТВА І ЛІКВІДАВАНЫЯ НЕДАХОПЫ

**Ігар СЕРГЯЕНКА праінспектаваў шэраг прадпрыемстваў і азнаёміўся з ходам правядзення вясенне-палявых работ ў Сенненскім раёне**

Старшыню Палаты прадстаўнікоў праінфармавалі, што ў раёне пасеяна больш за 40 % яравых збожжавых культур. Праз тыдзень асобныя гаспадаркі прыступаюць да сяўбы кукурузы.

Механізатары імкнуцца максімальна эфектыўна выкарыстаць кожны пагодлівы дзень. Уся сельгастэхніка знаходзіцца ў палях. Адзінкавыя выпадкі выхаду са строю тэхнікі аператыўна выпраўляюцца.



Фота прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.

У асобных гаспадарках, у прыватнасці, у камунальным сельскагаспадарчым унітарным прадпрыемстве «Саўгас імя Машэрава» выкарыстоўваюцца элементы дакладнага земляробства.

Ігар Сергяенка пракантраляваў ход выпраўлення выяўленых у лютым гэтага года недахопаў у арганізацыі ўтрымання буйной рагатай жывёлы ў зімова-стойлавы перыяд, захаванні ветэрынарна-санітарных правіл і тэхналагічнай дысцыпліны на жывёлагадоўчых комплексах ААТ «Белая ліпа», камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Саўгас імя Машэрава», а таксама сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Дружбінец».

У Сенненскім раёне з 40 малочнатаварных ферм толькі чатыры сучасныя комплексы, астатнія — 1960-70-х гадоў пабудовы і патрабуюць сур'ёзнай мадэрнізацыі. Выяўленыя раней праблемы ў асноўным былі выпраўлены. Работы па навядзенні парадку працягваюцца.

Акрамя таго, спікер азнаёміўся з тым, як арганізавана работа па абслугоўванні насельніцтва сельскай мясцовасці сеткай арганізацый Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў. На гандлёвых аб'ектах Белкаапсаюза харчовыя прадукты прысутнічаюць у неабходным асартыменце, грубых парушэнняў заканадаўства ў сферы цэнаўтварэння не выяўлена.

**Паводле прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**

ВЫСТАЎКІ

# БЕЛАГРА КЛІЧА!

**Беларускі аграпрамысловы тыдзень пройдзе на новай пляцоўцы**

Як паведамляюць арганізатары, месцам яго правядзення стане сталічны Міжнародны выставачны цэнтр па адрасе П. Мядзелкі, 24. А час правядзення традыцыйнага маштабнага дзейства запланаваны на пачатак чэрвеня.

Так, міжнародныя спецыялізаваныя выстаўкі «Белагра-2025», «Белферма», «Белпрадукт», «Прадмаш. Холад. Упак» пройдуць у Мінску ў рамках Беларускага аграпрамысловага тыдня з 3 па 7 чэрвеня 2025 года.

Гэты аграрны форум традыцыйна збірае разам не толькі беларускіх аграрыяў і работнікаў харчовай і перапрацоўчай прамысловасцяў, але і іх замежных калег і партнёраў. Напрыклад, у 2024 годзе ўдзел у выстаўцы прынялі 490 кампаній з 11 краін, у ліку якіх Беларусь, Расія, Кыргызстан, Казахстан, Манголія, Германія, Кітай, Пакістан, Турцыя, В'етнам і Палесціна. А колькасць наведвальнікаў перавысіла 85 тысяч чалавек.

— Усіх, хто як-небудзь датыкаецца да сельскай гаспадаркі, цікавіць, што новага з'яўляецца на рынку і над чым працуюць інжынеры-машынабудаўнікі. Якія новыя тэхналогіі прымяняюцца ўжо сёння, і што чакаць заўтра. Што сёння яшчэ з'яўляецца ідэяй, а што ў найбліжэйшы час убачым у новай сельгастэхніцы. На ўсе гэтыя пытанні можна знайсці адказ, наведаўшы «Белагра», — анансуюць арганізатары.

Так, шырока будуць прадстаўлены ўгнаенні і сродкі абароны раслін, тэхніка для ўнясення ўгнаенняў і аховы раслін, для ўборкі збожжавых і нарыхтоўкі кармоў, машыны для меліярацыйных работ, вырошчвання і ўборкі бульбы, цукровых буракоў і іншай гародніны. Сельскагаспадарчая прадукцыя, машыны, абсталяванне будуць дэманстравацца ў тэхналагічным ланцужку з сучаснымі энергазберагальнымі тэхналогіямі ўсіх галін, звязанымі як з вытворчасцю прадукцыі, так і з яе перапрацоўкай, транспарціроўкай, захоўваннем і рэалізацыяй.

Экспазіцыя выстаўкі «Белферма» прадэманструе апошнія дасягненні ў галіне жывёлагадоўлі. Кармушкі для жывёл і абсталяванне для іх утрымання, клеткавае абсталяванне і інкубатары, аўтаматызаваныя ўстаноўкі для малочна-таварных ферм. Будуць прадстаўлены новыя кармы і кармавыя дабаўкі, ветпрэпараты і медыкаменты, новыя тэхналогіі ў біяэнергетыцы, у тым ліку энергетычнае абсталяванне і яго праграмнае забеспячэнне.

Штогод вялікую цікавасць як у спецыялістаў, так і ў маленькіх наведвальнікаў выставы выклікае наведванне «рыбацкай вёскі», арганізаванай «Белводгас».

У выставачным павільёне будзе паказана сучаснае абсталяванне і матэрыялы для перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Тут размесцяцца экспазіцыі выставак «Прадмаш. Холад. Упак» — абсталяванне для прадпрыемстваў харчовай прамысловасці; «Белагра» — абсталяванне для перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, і «Белпрадукт. Харчовая індустрыя» — прадукты харчавання.

Каля 150 беларускіх вытворцаў прадставяць шырокі спектр прадуктаў харчавання: каўбасныя вырабы, мясныя паўфабрыкаты, птушку, малочную прадукцыю, кансерваваныя прадукты, бакалею, дзіцячае і дыетычнае харчаванне, хлебабулачныя вырабы і многае іншае. Прадпрыемствы харчпрама прапануюць наведвальнікам выстаўкі пакаштаваць сваю прадукцыю.

Асобную экспазіцыю на адкрытай пляцоўцы сфарміруюць вытворцы агароднінай прадукцыі. Наведвальнікі атрымаюць магчымасць не толькі азнаёміцца з новымі гатункамі гародніны, вырашчанымі ў нашай краіне, але і набыць іх.

У дні выстаўкі пройдуць усенародны дэгустацыйны конкурс «чэмпіён густу», «конкурс на лепшую племянную карову», конкурс «Лепшы племянны конь» і іншыя.

Галоўны акцэнт будзе зроблены на інавацыях «Белагра-2025». Разам з традыцыйнымі экспанатамі будуць прадэманстраваны інавацыйныя прадукты, перадавыя рашэнні і тэхналогіі.

Не застанецца па-за ўвагай наведвальнікаў «гандлёвы гарадок», які будзе ўяўляць сабой своеасаблівую выстаўку дасягненняў харчовай прамысловасці і кірмаш-продаж прадуктаў харчавання. Госці гандлёвага гарадка «Белагра-2025» змогуць набыць лепшыя прадукты, якія выпускаюцца айчыннымі прадпрыемствамі харчовай прамысловасці.

Уваход на выстаўку бясплатны.



# ІДЭАЛОГІЯ ФАШЫЗМУ НЕ МАЕ ПРАВА НА ІСНАВАННЕ

## Дакументальная дылогія «Беларусьфільма» — аб гэтым

У сталічным кінатэатры «Перамога», як і па ўсёй нашай краіне, адбылася вялікая прэм'ера: нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» прадставіла дылогію аб генацыдзе беларускага народа. Яна здымалася на працягу двух гадоў у шчыльным кантакце з Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь, па ініцыятыве якой і з'явіліся гэтыя карціны.

Яны змяшчаюць унікальныя архіўныя кадры, успаміны сведкаў, каментарыі спікераў. Перад праглядам усім жадаючым прапаноўвалі пакаштаваць «лагерны» хлеб з вадой, пазнаёміцца з выстаўкай Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, прысвечанай тэме генацыду і гісторыі стварэння фільмаў «Лагеры смерці» і «Спаленыя вёскі».

Паказ пакінуў вялікія ўражанні ў першых гледачоў, сярод якіх быў і **віцэ-прэм'ер Уладзімір КАРАНІК.**

— Глядзець было маральна цяжка, хоць мае нервы натрэніраваныя хірургіяй, — падзяліўся ён. — Адна справа, калі ты пра гэтыя жахі чытаеш, іншае — бачыць архіўныя матэрыялы, глядзець на целы замучаных жанчын, старых, на смерці дзяцей... Старэйшае пакаленне мне перадало праўду аб Вялікай Айчыннай вайне, штосьці ведаю па родзе сваёй дзейнасці. Але, калі я гляджу на вочы цяперашняй моладзі, разумею, што для яе гэта — шок. У мяне пасля прагляду першая думка: мы доўга маўчалі, і вельмі правільна, што мы нарэшце загаварылі, бо важна даносіць праўду аб нашай перамозе і якой цаной яна дасталася беларускаму народу. Гэта — гарантыя таго, што тыя падзеі ніколі не паўтарацца.

> **Лічу непрымальнай тую ідэалогію, якая прымала такія страшэнныя антычалавечыя формы. Яна не мае права на існаванне. Таму ўсе спробы яе рэабілітаваць, неяк абяліць, натуральна, выклікаюць абсалютнае непрыманне ў кожнага разумнага чалавека.**

На думку віцэ-прэм'ера, гэтыя фільмы важна паглядзець кожнаму беларусу. А яшчэ зрабіць усё магчымае, каб данесці праўду пра вайну і замежнаму гледачу таксама.

Прысутнічалі на прэм'еры і блізкія вядомага беларускага рэжысёра Аляксандра Анісімава, які і зняў гэту дылогію (на фінальным этапе карціну дапрацоўваў Уладзімір Луцкі з-за раптоўнай смерці свайго калегі). «Вядома, гэтыя фільмы глядзець вельмі няпроста. Не толькі таму, што бацька іх не змог завяршыць, але і таму, што разумееш, наколькі ў людзей не было выбару, не было нармальнага жыцця. Нават цяжка ўявіць сябе на месцы тых людзей, бо гэта не ўкладваецца ў галаве наогул», — гаворыць **сын Аляксандра Анісімава Глеб.**

**Кацярына АКРУТНАЯ, вядучы бібліёграф аддзела апрацоўкі дакументаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**, ужо некалькі гадоў па родзе сваёй працы мае дачыненне да вывучэння тэмы генацыду беларускага народа, таму не магла абмінуць такую прэм'еру. «Гэтыя фільмы — вялікі ўнёсак у захаванне нашай памяці, і такога кіно павінна быць яшчэ больш, — кажа яна. — Інфармацыі пра вайну многа, але, каб не заблытацца ў ёй і атрымліваць сапраўды праўдзівую інфармацыю, важна чуць яе ад сведак эпохі».

**Ірына ПРЫМАК.**

# КНІГІ, ВЕРНУТЫЯ З ПАЛОНУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Першыя месяцы вайны былі вельмі цяжкімі. Вораг імкліва прасоўваўся ўглыб нашай краіны, з гэтай прычыны не былі эвакуіраваны заводы, фабрыкі, музеі і бібліятэкі розных буйных гарадоў, у тым ліку і Мінска.

— Нямецка-фашысцкія акупанты на захопленых землях пачалі планавае рабаванне і перамяшчэнне культурных каштоўнасцей з тэрыторыі нашай краіны. Паводле шэрагу нямецкіх даследчыкаў, з тэрыторыі СССР было перамешчана або знішчана каля 180 млн кніг, аднак нашы спецыялісты сцвярджаюць, што іх было значна болей. Лічба можа складаць ад 200 да 250 млн кніг. У БССР было знішчана каля 95% фондаў бібліятэк, — расказаў дырэктар Прэзідэнцкай бібліятэкі Сяргей Квачан.

Цяпер пры Савеце Міністраў створана профільная камісія па выяўленні, вяртанні і сумесным выкарыстанні кніжных рэсурсаў, якія былі перамешчаны за межы нашай рэспублікі падчас Вялікай Айчыннай вайны.

— Перыядычна вынікі работы камісіі публікуюцца ў друку. З гэтага года супрацоўнікі нашай бібліятэкі таксама ўвайшлі ў склад рабочай экспертнай групы і пачалі маніторынг замежных аўкцыёнаў з мэтай вяртання кніг Урадавай бібліятэкі, — адзначыў Сяргей Квачан.

Паводле слоў вучонага сакратара Элеаноры Гурыновіч, бібліятэка правяла вялікую навукова-даследчую работу, вывучыўшы асабістыя справы і дакументальныя хронікі для таго, каб знайсці 25 супрацоўнікаў Урадавай бібліятэкі, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне.

— Напрыклад, Белакурская Надзея Аляксееўна, супрацоўнік Урадавай бібліятэкі з 1939 года, разведчыца 279 батальёна, вярнулася ва Урадавую бібліятэку пасля заканчэння вайны і займалася аднаўленнем фонду. Мы знайшлі шматлікія камандзіровачныя пасведчанні, дзе Надзея Аляксееўна літаральна па крупінках з усёй краіны збірала кнігі для гэтай бібліятэкі, — распавяла Элеанора Гурыновіч.



Ёсць шэраг справаздач, якія дэманструюць працу супрацоўнікаў па аднаўленні фондаў. Часам даходзіла да таго, што яны заходзілі ў кожную хату ў пошуках згубленых кніжных скарбаў. Сярод дакументаў ёсць і Справа №1 ад 1944 года «Акты, спісы і распіскі, звязаныя з паступленнем кніг у Бібліятэку».

Нам удалося на свае вочы ўбачыць кнігі, якія вярнулі на Радзіму. Сёння яны захоўваюцца ў аддзеле старадрукаў і рэдкіх выданняў. Характэрна тое, што на многіх з іх была размешчана гербавая пячатка нацысцкай Германіі.

— Гэта сведчанне таго, што кнігі былі ўжо атрыманы ў германскіх бібліятэках і заінвентарызаваны. Аднак пасля вяртання на Радзіму многія з гэтых пячатак былі проста замазаны. Недзе цалкам, недзе фрагментарна... Аднак быў і вельмі ўнікальны падыход, які дэманструе нянавісць нашых калег да фашызму. Бібліятэкары проста выразалі пячаткі, нягледзячы на тое, што псаванне кнігі — гэта парушэнне прафесійнага этыкету, — распавяла загадчык аддзела старадрукаваных і рэдкіх выданняў Наталля Івашынка.

Паводле яе слоў, вывозілі не толькі кнігі па мастацтве, але таксама і выданні па ваеннай навуцы. Да таго ж германскаму ўраду была цікавая філасофія, палітыка і тэма аднаўлення краіны пасля Першай сусветнай вайны.

Таксама ў аддзеле старадрукаваных і рэдкіх выданняў нам удалося ўбачыць і іншыя цікавыя кнігі часоў Вялікай Айчыннай вайны ў рамках мультымедыйнага праекта «Мы пераможам». З усіх кніг вельмі вылучалася выданне з практычна аднайменнай назвай.

— Кнігу, прысвечаную ўкладу жанчын у Перамогу напісаў Яўген Няміраў. Поўная назва: «Мы пераможам! Савецкая жанчына ў Айчыннай вайне». Яна была выпушчана ў 1943 годзе невялікім тыражом у 3 тысячы экзэмпляраў. Для таго часу гэта было даволі каштоўнае выданне, бо грошы эканомілі і кнігі друкаваліся невялікага фармату на жоўтай няякаснай паперы. А тут перад намі вялікі фармат, вокладка ўпрыгожаная барэльефам, шчыльныя светлыя старонкі з вялікай колькасцю фатаграфій, — расказала намеснік загадчыка аддзела старадрукаваных і рэдкіх выданняў Іна Байдакова.

Таксама ў гэтым аддзеле прадэманстравалі мультымедыйны праект «Гістарычная памяць — наша культурная спадчына», які дазволіў пазнаёміцца з кнігамі, якія ў прамым сэнсе слова размаўляюць з чытачом.

Цікавыя і сумесныя праекты Прэзідэнцкай бібліятэкі з прадпрыемствамі «Белгеадэзія» і «Белдзіпразем». Так, увазе наведвальнікаў прадстаўляюцца ўнікальныя карты і рэдкія фатаграфіі, а таксама фотапраект з дапоўненай рэальнасцю «80 гадоў міру». Са стэндаў на нас глядзяць нашчадкі герояў Вялікай Айчыннай вайны з фатаграфіямі сваякоў у руках. Але варта толькі адсканаваць QR-код, і на экране смартфона адбываецца сапраўдны цуд: мінулае перасякаецца з сучаснасцю, і ўнук можа абняць свайго дзеда-героя.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

Гэты дзень мы набліжалі як маглі 9 мая

# ПІНСК. НА ГЕНАЦЫД І ЗВЕРСТВЫ АДКАЗАЛІ ЎСЕНАРОДНЫМ СУПРАЦІВАМ

## АД НЕВЯЛІКАЙ ГРУПЫ — ДА ЦЭЛАГА ЗЛУЧЭННЯ

У гэты ж дзень патрыёты Пінска ўсталі на абарону свайго горада і дзейнічалі да самага яго вызвалення. Вечарам 22 чэрвеня ў Пінску пачалося фарміраванне аднаго з першых у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны партызанскіх атрадаў. Яго ўзначаліў загадчык сектара абласнога камітэта партыі Васіль Корж. У атрад увайшлі камуністы і камсамольцы горада. Сярод іх былі Сяргей Карнілаў і яго жонка Вера Харужая, Рыгор Карасёў, Эдуард Нордман. Са зброі атрад меў некалькі вінтовак, па 5-10 пачкаў патронаў на чалавека, гранаты і пару пісталетаў. Але праз тры дні, 26 чэрвеня, партызаны затрымалі нямецкіх разведчыкаў-парашутыстаў, а 28 чэрвеня на дарозе Пінск-Лагішын устроілі засаду на нямецкія лёгкія танкі, здабылі боепрыпасы, карты праціўніка, узялі палонных. Гэты бой, у якім партызаны, дарэчы, не страцілі ніводнага байца, лічыцца першым у гісторыі партызанскага руху СССР. Тая маленькая перамога мела найбольш псіхалагічны эфект, захопнікі такога яўна не чакалі.

Ужо праз год актыўнай баявой работы злучэнне Каржа мела свой аэрадром, шпіталь для лячэння раненых, у лясной друкарні выходзіла газета «Палеская праўда». У верасні 1943 года партызанскаму камандзіру прысвоілі званне генерал-маёра.

## ПАРТЫЗАНСКІ КАМБРЫГ КОРЖ

Варта сказаць, што герой вайны адначасова быў і народным героем. Нездарма ж яго памяць так беражліва шануюць землякі. Усе названыя факты яшчэ раз згадваліся пры ўрачыстым адкрыцці помніка Герою Савецкага Саюза Васілю Каржу ў чэрвені 2023 года. Начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Пінскага райвыканкама Юрый Бушык падкрэслівае несумненны аўтарытэт партызанскага камбрыга: «Сваім падначаленым ён гаварыў: «Мы ваюем за народ. Наша апора і надзея — мясцовае насельніцтва. Галодны — папрасі, людзі апошнім падзеляцца. Сілай возьмеш — ніколі не даруюць. Не крыўдзіць, а бараніць насельніцтва — наша задача!» Засталіся сведчанні таго, як жорстка абыходзіўся ён з рабаўнікамі, мог і застрэліць такога перад строем».

Дарэчы, з пачатку вайны Корж узяў псеўданім Камароў, а яго падшэфных называлі камароўцамі. Дык вось камароўцы стараліся своечасова атрымліваць разведданыя пра планы карных аперацый у вёсках і загадзя выводзілі жыхароў у лес. Такім чынам было выратавана нямала людзей. Да Каржа ў злучэнне ішлі людзі. Народныя мсціўцы не давалі спакойна жыць акупантам.



## ЗВЕРСТВЫ, ЯКІХ НЕ БАЧЫЛА І СЯРЭДНЯВЕЧЧА

... Але вернемся ў Пінск. Вораг заняў яго 4 ліпеня. З гэтага дня вядзе адлік трагедыя яўрэйскага насельніцтва горада, якое да вайны складала большасць. Па гэтай тэме найлепшым экспертам, несумненна, з'яўляецца Ірына Яленская, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры эканомікі і бізнесу Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта. Ірына Эдуардаўна расказвае, што ў жніўні 1941-га ўсе яўрэі Пінска прайшлі рэгістрацыю, а ў маі 1942-га яны былі змешчаны ў гета. Акрамя 18 640 пінчукоў туды трапілі яўрэі з еўрапейскіх краін, а таксама з бліжэйшых мястэчак. Па часе стварэння пінскае гета стала апошнім на тэрыторыі Беларусі. Яно было агароджана калючым дротам, мела тры выхады, якія ахоўвалі. Вязні працавалі на прадпрыемствах і ў майстэрнях горада, выконвалі іншую цяжкую працу. У гета ад самага пачатку ствараліся падпольныя групы. Немцы гэта ведалі і апасаліся яўрэйскага супраціву. Таму яны імкнуліся ў першую чаргу знішчаць яўрэяў-мужчын ва ўзросце ад 15 да 50 гадоў, нягледзячы на тое, што такім чынам пазбаўляліся найбольш працаздольных вязняў. У архіўных дакументах паведамлялася, што да другой паловы 1942 года ў гета амаль не заставалася вязняў-мужчын.

Ірына Яленская прыводзіць успаміны відавочцаў. Вось што гаварыў Уладзімір Юльянавіч Кротаў: «28 кастрычніка 1942 года пачалося канчатковае знішчэнне вязняў. Гета было акружана атрадамі немцаў СС, былі пастаўлены кругом кулямёты. Вайскоўцы атрадаў СС, узброеныя дадаткова палкамі і дубінамі, з розных бакоў увайшлі ў гета і сталі выганяць усіх агулам — старых, жанчын, дзяцей, маці з немаўлятамі, хворых, усіх палкамі зганялі на яўрэйскія могілкі паблізу бальніцы. Тых, хто спрабаваў уцячы, расстрэльвалі альбо забівалі ўдарамі палак па галаве на месцы. На могілках таксама праз пабоі аддзялялі групы па некалькі сот чалавек і накіроўвалі, увесь час збіваючы, праз Шчытавую і Ляшчынскую вуліцы за горад на ўчастак былога аэрадрома ў Добрую Волю, дзе былі падрыхтаваныя вялізныя ямы-магілы. Людзям загадвалі распранацца, уводзілі ў ямы, укладвалі радамі і забівалі. Бацькі павінны былі ўводзіць альбо ўносіць у ямы сваіх дзяцей, каб разам памерці. Патокі і цэлыя лужыны крыві стаялі на вуліцах гета і па шляху людзей за горад. Гэта было страшэнна. На свае вочы бачыў на вуліцы трупы людзей у лужынах крыві, раскіданыя па дарозе адзенне, пасмы валасоў, парваныя грошы, хатнія рэчы...»

Даследчык прыводзіць сведчанні яшчэ аднаго жыхара Пінска Уладзіміра Адамавіча Вербановіча. Вось што ён напісаў у 1944 годзе: «Тая жудасная трагедыя, якая адбылася ў нашым параўнальна невялікім горадзе, не можа быць апісана ці ахарактарызавана ў поўным сэнсе слова. Няма тых слоў, якімі можна выразіць тое, што адбылося ў XX стагоддзі, калі культура і цывілізацыя дасягнулі найбольшага росквіту... Віноўнікі, якіх нельга назваць людзьмі, асмельваліся заяўляць, што па культуры сваёй стаяць вышэй за ўсе іншыя нацыі... Калі б да вайны з'явіўся нейкі прарок, які б расказаў, што будзе, як гэта будзе адбывацца, яму б ніхто не паверыў. Аднак гэта адбылося...» У Пінску было знішчана двое з трох жыхароў. Такіх страт горад не ведаў за ўсю сваю гісторыю.

## ПОДЗВІГ ПАЛЕСКАГА СУСАНІНА

У адказ на гэтыя зверствы, якіх не бачыла нават самае змрочнае Сярэднявечча, людзі сталі ствараць падпольныя арганізацыі і групы. Антыфашысцкае падполле, якое складалася фактычна з моладзі, існавала ў Пінску з верасня 1942 да пачатку 1944 года, — расказалі ў Музеі Беларускага Палесся.

Адважныя камсамольцы нарыхтоўвалі харчы, адзенне, медыкаменты для партызан, збіралі боепрыпасы, дапамагалі акружэнцам-чырвонаармейцам, хавалі іх ад немцаў і лячылі параненых. Удзельнікі падпольных груп узарвалі будынак СД, у выніку акцыі загінула некалькі гестапаўцаў. Затым прагучалі выбухі ў нямецкай краме, у мадзьярскай казарме, у лазарэце. Восенню 1942 года падпольшчыкі спалілі дзве падсобныя гаспадаркі акупантаў.

Вораг адцягваў вялікія сілы на барацьбу з партызанамі. Для гэтага зімой 1943-га з фронту былі зняты тры дывізіі. Яны імкнуліся ўзяць народных мсціўцаў у акружэнне і знішчыць. Але дзякуючы патрыётам план гітлераўцаў стаў вядомы, і камандаванне злучэння загадзя выводзіла атрады з-пад удару.

Непакорныя палешукі давалі адпор ворагу нават тады, калі ведалі, што ідуць на смерць. Прыклад таму — подзвіг братоў Цуба з вёскі Навіны. Акупанты шукалі праваднікоў. Калі яны зайшлі ў вёску, Іван Цуба выганяў з хлява карову. Яго павялі да дома, з якога ўжо паспелі выцягнуць яго 75- гадовага брата Міхаіла. Апошні адразу адмовіўся паказваць дарогу да партызан. Яго застрэлілі на парозе дома. А Іван пагадзіўся стаць правадніком. І завёў фашыстаў у багну Грачылаўскіх балот, з якой тыя ўжо не выбраліся.

У кнізе «Партызанскія збройнікі» ёсць цікавыя звесткі пра кіраўнікоў збройных майстэрняў атрада імя Катоўскага. Паведамляецца, што многія партызаны былі ўзброены новымі аўтаматамі тыпу ППШ. Іх выраблялі былы пінскі кінамеханік Якаў Менкін, былы гадзіннікавы майстар Васіль Нягрэй, ваентэхнік Якаў Цемякоў. Названымі аўтаматамі быў узброены амаль увесь камандны склад брыгады імя Будзённага. Такі ж аўтамат меў і Васіль Корж. З ворагам змагаліся ўсімі даступнымі сродкамі.

Пінск быў вызвалены 14 ліпеня 1944 года. А ў 2010-м горад узнагароджаны вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!
Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі
ЗВЯЗДА
ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

# ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ

### • На фронце

Паводле звестак Савецкага інфармбюро, за апошнія тры дні ў раёне Цэнтральнай групы нашых войск вялася сілавая разведка, якая перарасла ў баі па захопу і расшырэнні плацдармаў на рэках Одэр і Нейсе.

«**У выніку гэтых баёў нашы войскі на Дрэздзенскім напрамку фарсіравалі раку Нейсе і авалодалі гарадамі Форст, Мускау, Вейвасер. Войскі 2-й Польскай арміі занялі Ротэнбург**», — паведамляла «Звязда».

На Одэры нашы войскі захапілі і расшырылі плацдарм на захадзе ад Кюстрына. На працягу 19 красавіка на тэрыторыі Чэхаславакіі, на паўночным усходзе і поўначы ад горада Гадонін, войскі 2-га Украінскага фронту вялі наступальныя баі і занялі населеныя пункты Казаідкі, Лідэровіцэ, Заразіцэ, Бзенец, Скараніцэ, Стаўешыцэ, Наседловіцэ і чыгуначныя станцыі Лідэровіцэ, Сватаборжыцэ. На поўначы ад Вены войскі фронту з баямі занялі на тэрыторыі Аўстрыі населеныя пункты Бернгардсталь, Альт Ліхтэнварт, Вільферсдорф, Зібеніртэн, Аспарн, Ладэндорф і чыгуначныя станцыі Альт Ліхтэнварт, Аспарн.


Ад Совецкага Інформбюро
АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 19 КРАСАВІКА

### • У тыле

Да Айчыннай вайны ў калгасе «Новы шлях», што ў Дрысенскім раёне (у 1962 годзе Дрыса стала Верхнядзвінскам), было 320 галоў буйной рагатай жывёлы, 85 свіней і 120 авечак. «**Была і птушкаферма, — паведамляла наша газета. — Нямецкія захопнікі нанеслі калгасу вялікія страты. Яны знішчылі грамадскую жывёлагадоўлю. Аднаўляючы арцельную гаспадарку, калгаснікі паставілі сабе мэту — на працягу 2-х год зрабіць свой калгас такім, якім ён быў да вайны**».

У «Новы шлях» вясной 1945-га накіраваўся карэспандэнт «Звязды» М. Курловіч. Яго спадарожнікам стаў пажылы калгаснік, імя якога ў газеце не называлася. Ён расказваў: «Гэта ўжо наша зямля і нашы калгаснікі працуюць. Садзіць бульбу мы тут будзем яшчэ няскора, але, каб захаваць у глебе вільгаць, скародзім зябліва».

Карэспандэнт нашай газеты ў сваім рэпартажы ўзгадваў загадчыка МТФ калгаса «Новы шлях», які абяцаў: «Да канца года калгас будзе мець на ферме 140 галоў буйнай рагатай жывёлы. Пагалоўе папаўняецца галоўным чынам за лік катрактацыі цялят у калгаснікаў. Аўцаферма павялічваецца да 150 авечак, а птушкаферма — да 500 курэй».

«**Калі мы прышлі з калгаснага двара ў канцылярыю, ужо было цёмна. Сюды збіраліся брыгадзіры, звеннявыя, калгаснікі. Яны ўважліва чыталі насценную газету, у якой змешчана зводка ходу палявых работ**», — пісаў М. Курловіч.

На той час у «Новым шляху» было ўзарана 8,5 гектара зямлі. Такія лічбы прыводзіў брыгадзір Павел Хадкевіч: «Пяршынства трымае звяно Сцепаніды Шыманскай».

**М. Курловіч паведамляў, што на другі дзень раніцай на калгасны двор амаль адначасова прыйшлі ўсе калгаснікі. Да іх прыходу коні былі ўжо падрыхтаваныя: «Можна запрагаць», — казаў старшы конюх. Хутка ў полі кіпела дружная работа...**

Такім чынам, палявыя работы і сяўба ў калгасе «Новы шлях» праходзіла дружна і арганізавана. Праўленне калгаса арганізавала для людзей, якія працуюць на полі, дастаўку гарачых абедаў. «Усе мерапрыемствы тут накіраваны на хутчэйшае і высокаякаснае завяршэнне веснавой сяўбы, на атрыманне ў гэтым годзе з кожнага гектара не менш за 13 цэнтнераў збожжавых культур і 180 цэнтнераў бульбы». Асобныя звенні змагаліся за яшчэ больш высокі ўраджай.

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белцветмет», Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово. УНН 100088666 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Бытовое помещение типа М-К2-2-15 В.1** **(18 кв. м,** 2003 г. в.). Адрес: Могилевский р-н, аг Полыковичи, ул. Подгорная, 1В | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 1 800,00 бел. руб.** (снижена на 50 %) ***Шаг аукциона: 5 % от текущей цены*** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов: 10 рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 10 % от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 28.02.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 02.05.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 30.04.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные данные: +375 17-310-36-37, +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by** | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Арктраст», г. Минск, ул. Харьковская, 15, помещение 311 |
| **Предмет электронных торгов** | **Начальная цена без НДС, долл. США*** |
| **Лот № 1 – Здание многофункциональное** (Здание специализированное иного назначения) с инв. номером 600/С-173782 общей площадью 1515,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Петришковский с/с, д. Кирши, ул. Центральная, 17Б/10. Составные части и принадлежности: цокольный этаж (5А1/кз), три пристройки (5Б1/кз, 5В1/кз, 1), два навеса (а, б) | **659 373,00** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 623685704101000230:** предоставлен на праве аренды по 03.05.2026 для строительства и обслуживания здания многофункционального общей площадью 0,1628 га | |
| **Лот № 2 – Здание многофункциональное** (Здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные, зарядные и газонаполнительные станции)) с инв. номером 600/С-169914 общей площадью 1257,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Петришковский с/с, д. Кирши, ул. Центральная, 17Б/4 | **547 099,50** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 623685704101000221:** предоставлен на праве аренды по 03.05.2026 для строительства и обслуживания здания многофункционального общей площадью 0,1864 га | |
| ***Цена продажи предмета электронных торгов фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долл. США по курсу НБРБ на дату проведения торгов** | |
| **Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 20.05.2025 г. с 11.00 до 13.00** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **19.05.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33, +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ЧУП «ЛАВТЕХ», УНП 690298046, 222417, Минская область, г. Вилейка, ул. Шубина 3А, оф. 7 |
| **Предмет электронных торгов (б/у):** Кормоуборочный комплекс УЭС 2-250А Полесье, модель 2999, рег. № ОН-5 9112, 2005 г. в., расположенный по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. Шубина, 3А | **Начальная цена (без НДС) – 8250,00 бел. руб.** |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 21.05.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **20.05.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор купли-продажи для подписания победителю аукциона | |
| **Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 10 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов. Подробная информация по размеру затрат и вознаграждения опубликована на сайте www.ipmtorgi.by в карточке предмета электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33, +375 (44)-704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |


ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ

# ХВАРОБЫ — У «АРХІЎ»

## Да гэтага сёння імкнецца медыцына



У нашы дні ахова здароўя — адна з найбольш інавацыйных галін навукі. Менавіта ў медыцыну па ўсім свеце перш за ўсё інтэгруюцца высокія тэхналогіі і найноўшыя навуковыя распрацоўкі. Мы пабывалі на выстаўцы ў рамках 30-га, юбілейнага Міжнароднага медыцынскага форуму «Ахова здароўя Беларусі — 2025», дзе свае дасягненні прадставілі больш за 190 экспанентаў з розных краін. І высветлілі, што будучыня медыцыны больш шматгранная і складаная, чым лекі ад раку ці перамога над каранавірусам.

Калі ўсё вельмі спрасціць, то будучыня медыцыны сёння бачыцца навукоўцам і практыкам як максімальнае падаўжэнне жыцця чалавека.

**Але ключавым тут становіцца пытанне якасці гэтага самага доўгага жыцця, якая павінна дасягацца захаваннем здароўя на доўгія гады. Гэтай мэце служаць перадавыя дасягненні фізікі і хіміі, генетыкі і біялогіі, інфарматыкі і лічбавых тэхналогій, якія медыцына акумулюе і накіроўвае на служэнне здароўю чалавека.**

### КАПСУЛЫ ЗДАРОЎЯ І ПРЭВЕНТЫЎНАЯ МЕДЫЦЫНА

— У Беларусі сёння паверылі ў айчынныя лекавыя прэпараты, — адзначае **начальнік сектара маркетынгу ААТ «Экзон» Крысціна ПРАКАПУК.** — Ці ёсць сэнс набываць імпартныя лекі, дапусцім, за 60 рублёў, калі айчынны, не менш эфектыўны прэпарат можна купіць за 25? Вядома, некаторыя прэпараты беларуская фармацэўтычная галіна пакуль не вырабляе. Але, у цэлым, сваю нішу мы занялі, павагу спажыўцоў заваявалі. Мы працуем з якаснай субстанцыяй, тэхналогіі вытворчасці беларускіх лекаў адпавядаюць стандартам GMP, так што давер людзей апраўданы.

Фармацэўтычная галіна нашай краіны прадставіла сёлета мноства інавацый. Інстытут біяарганічнай хіміі паказаў новыя супрацьпухлінныя лекавыя сродкі, якія распрацаваны ў НПЦ «ХімФармСінтэз». Інстытут радыёбіялогіі — сонцаахоўны кампазіт з экстрактаў лішайнікаў (прынцыпова новы падыход да абароны скуры ад шкоднага ўздзеяння ультрафіялету), а таксама харчовую дабаўку на аснове стрэс-актываванай біямасы спіруліны, што ўмацоўвае імунітэт. Інстытут біяхіміі біялагічна актыўных злучэнняў прэзентаваў інавацыйны сродак, які залечвае раны.

Прэвентыўная медыцына — адзін з трэндаў сучаснасці, і сёння, распавялі фармацэўты, ідзе пераарыентацыя ад барацьбы з сімптомамі, як гэта было яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму, да пошуку прычын развіцця паталогій і вывучэння псіхафізічных фактараў узнікнення захворванняў. Пастапленне ў арганізм усіх неабходных вітамінаў і мікраэлементаў — адна з ключавых умоў гарманічнай працы ўсіх органаў і сістэм, і на гэта накіраваны вітамінныя комплексы і БАДы новага пакалення, якія прадставіў лідар беларускай фарміндустрыі «Мінскінтэркапс».



— Радуе, што сёння ў Беларусі людзі клапоцяцца пра здароўе: імкнуцца сачыць і за якасцю харчавання, і за дастатковай фізічнай актыўнасцю, пазбягаюць шкодных звычак, — падкрэсліў **прадстаўнік кампаніі «Мінскінтэркапс» Аляксей НІКАНЧЫК.** — І не купляюць вітаміны і БАДы бяздумна, а здаюць аналізы, каб дакладна ведаць, чаго не хапае арганізму.

### ГЕНЕТЫЧНЫЯ ТЭСТЫ І ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ

Цяжкімі або невылечнымі большасць хвароб становяцца з-за позняга звароту да ўрача. Адпаведна, ранняя дыягностыка — адзін з прыярытэтаў сучаснасці. Новыя тэхналогіі павінны быць вельмі дакладнымі, дзякуючы чаму ўрачы змогуць адсочваць узнікненне захворванняў на вельмі ранніх стадыях. У гэтым кірунку ўжо зроблены істотныя крокі. Так, генетычная медыцына — вобласць медыцынскай навукі, што развіваецца надзвычай хутка. Сучасныя генетычныя тэхналогіі дазваляюць карэкціраваць стан арганізма, прадухіляючы паталогіі ў рэпрадуктыўнай медыцыне, кардыялогіі, эндакрыналогіі і г. д.

— У нас шырокі спектр распрацовак у галіне генетычнага тэсціравання — гэта сардэчна-сасудзістыя захворванні, астэапароз, дыябет, невынашванне цяжарнасці, мужчынскае бясплоддзе і гэтак далей, — распавяла **загадчыца аддзела навуковай і інавацыйнай работы Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Маргарыта БОРТНІК.**

Тэсціраванне праходзіць бязбольна, не патрабуе падрыхтоўкі, можа быць праведзена нават груднічкам. На аснове атрыманых даных урач праводзіць медыкаментозную карэкцыю, прадухіляючы развіццё паталогій у пацыента.

На рашэнне праблемы ранняй дыягностыкі анкалагічных захворванняў накіраваны распрацоўкі з выкарыстаннем штучнага інтэлекту.

— Мы прадстаўляем нашу распрацоўку «Faust view». Праграма выяўляе рак малочнай залозы на ранніх стадыях, якія прадугледжваюць у многіх выпадках безаперацыйнае, неінвазіўнае лячэнне, — распавёў **кіраўнік ТАА «Элітсофт» Юрый БАЛЬ.** — Жанчыны праходзяць мамаграфію, здымак загружаецца ў праграму, і яна паказвае на што звярнуць увагу. Наша праграма — гэта «другое меркаванне». Трэба разумець, што штучны інтэлект не заменіць спецыяліста-анколага. Але гэта вельмі эфектыўны памочнік урача.

**Калі чалавек прымае мноства пацыентаў у і можа прапусціць, не заўважыць драбнюткія змены тканін, тлумачыць суразмоўца. Сістэма аналізуе выявы «без стомы», знаходзіць праблемы і паказвае на іх.**

Праграма ўжо працуе ў Гомелі, на базе некалькіх устаноў аховы здароўя, распавялі распрацоўшчыкі. Упершыню яна была апрабавана пазалетась на эканамічным форуме, які праходзіў у гэтым абласным цэнтры.

### ГІПЕРГРАВІТАЦЫЯ І БЯЗВАЖКАСЦЬ

Спектр айчынных медыцынскіх інавацый на выставе «Ахова здароўя Беларусі — 2025» быў сапраўды шырокі. Толькі арганізацыі Нацыянальнай акадэміі навук прадставілі 140 новых тэхналогій і распрацовак. Сярод іх — унікальная ўстаноўка для гіпергравітацыйнай тэрапіі. У ходзе працэдуры чалавек раскручваецца вакол восі галавы, тлумачыць **супрацоўнік аддзела новай тэхнікі НВА «Цэнтр» Канстанцін ЖУК.** Устаноўка спраектавана так, што галавакружэння пацыент не адчувае нават пры хуткасці кручэння да 40 абаротаў у хвіліну. У выніку нармалізуецца цыркуляцыя крыві, зніжаецца артэрыяльны ціск, праходзяць мігрэні, вырашаюцца многія праблемы з крывяноснай сістэмай і сасудамі.

— Падчас выпрабаванняў устаноўкі, пасля 5-10 хвілін гэтай працэдуры людзі казалі, што іх стан параўнальны з тым, які бывае пасля здаровага васьмігадзіннага сну: яны адчувалі сябе бадзёрымі і поўнымі сіл, — распавёў спецыяліст.

Яшчэ адна распрацоўка навукоўцаў НВА «Цэнтр» — імерсійная (або сухая) ванна, якая стварае адчуванне бязважкасці. Працэдура зніжае выпрацоўку гармона стрэсу карцізолу, лечыць ад трывожных станаў і дэпрэсіі.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# І БАСЕЙН ПАМІЖ УРОКАМІ

### ДЛЯ ХВОРЫХ ДЗЯЦЕЙ І НЕ ТОЛЬКІ

Аграгарадок Свіслач — населены пункт з цікавай гісторыяй. Калісьці гэта быў цэнтр княства, а на сутоцы рэк Беразіна і Свіслач стаяў замак. Ён не захаваўся, але месца не згубіла сваёй прыцягальнасці. Зараз цэнтральны аб'ект населенага пункта — дзіцячы санаторый, дзе сваё здароўе папраўляюць дзеці з «чарнобыльскіх» раёнаў Магілёўскай вобласці, шматдзетных сем'яў, тых, што патрапілі ў сферу ўвагі сацыяльных службаў, і наогул усе, у каго ёсць жаданне адпачыць з карысцю.

— Наша ўстанова ад «Белпрафсаюзкурорта», — расказвае начмед санаторыя Зоя Навасёлава. — Разлічана яна на 240 чалавек. Дзеці, якія прыязджаюць групамі, знаходзяцца тут 21 дзень, самастойна — 18. Наогул прымаем дзяцей з усёй Беларусі, у тым ліку ў суправаджэнні дарослых. Членам прафсаюза прадугледжана зніжка — 25 % . Базавы пакет працэдур — фітачай, мінеральная вада, араматэрапія, галатэрапія, басейн. Акрамя гэтага дзеці атрымліваюць фізіялячэнне, цеплалячэнне, бальнеапрацэдуры і іншыя.



На тэрыторыі некалькі будынкаў, усе карпусы — спальны, лячэбны, школьны — злучаныя паміж сабой ацяпляльнымі галерэямі. Установа арыентавана на лячэнне органаў дыхання, страўнікава-кішачнага тракту, сардэчна-сасудзістых захворванняў, касцёва-суставай сістэмы. У штаце два педыятры, тэрапеўт, стаматолаг. Дзеці прыязджаюць з медыцынскім дакументам, дзе прапісаны ўвесь іх анамнез. У канцы змены ім выдаюць даведку, дзе пазначана, якія працэдуры яны атрымалі.

Нягледзячы на тое, што гэта санаторый, вучэбны працэс наладжаны самы што ні на ёсць паўнавартасны. Тут працуе цалкам укамплектаваны педкалектыў, для навучання дзяцей ёсць усё неабходнае, нават падручнікі. З дому школьнікі прывозяць толькі свае сшыткі і ручкі.

Акрамя вучобы і лячэння, прапануюцца культурна-масавыя і спартыўныя мерапрыемствы, распрацавана некалькі церанкур-маршрутаў. Санаторый усяго ў некалькіх сотнях метраў ад ракі Свіслач, вакол змешаны лес. На тэрыторыі функцыянуюць дзве ўласныя свідравіны з мінеральнай вадой.

— Свідравіны з рознай мінералізацыяй, — удакладняе начмед. — Адна выкарыстоўваецца для піцця, другая — з высокай мінералізацыяй — для ваннаў і басейна.

Летам на базе санаторыя працуюць спартыўна-аздараўленчыя лагеры. Летась, напрыклад, прыязджалі валейбалісты з Масквы.

— Мы прымаем падлеткаў да 17 гадоў уключна, нават, калі да 18-годдзя застаўся месяц, — звяртае ўвагу маркетолаг Святлана Залеўская. — На працягу года адбываецца 18 заездаў, агульная колькасць пуцёвак складае 2400.

Летась установа запусціла пілотны праект з турыстычным агенцтвам «Сямейны адпачынак». А нядаўна тут сталі практыкаваць туры выхаднога дня. Першая група з Барысава ў складзе 42 чалавек засталася вельмі задаволенай.

Сёлета ўстанова запусціла тэлеграм-канал «Санаторый-Свіслач», каб бацькі маглі адсочваць, як тут бавяць час іх дзеці. І колькасць карыстальнікаў за два месяцы дасягнула ўжо амаль 400 падпісчыкаў.

### МЕСЦА З ГІСТОРЫЯЙ

Санаторыю сёлета спаўняецца паўвека, але гісторыя некаторых будынкаў, у якіх ён размешчаны, багатая. Спачатку тут размяшчаўся дзіцячы дом, потым школа-інтэрнат, а ў 1975 годзе ўсё было перапрафілявана пад санаторый.

Ніна Леанідаўна Сакава калісьці вучылася тут у школе-інтэрнаце, а зараз часова выконвае абавязкі начальніка службы вучэбна-выхаваўчай работы. Яна ўлюбёная ў сваю малую радзіму і ахвотна дзеліцца гэтай любоўю з дзецьмі.

— Гэта незвычайнае месца, — з гонарам кажа яна. — На тэрыторыі Беларусі чатыры Свіслачы, але асіповіцкая асаблівая. Нашы выхаванцы жывуць тут у геаграфічным цэнтры кантынентальнай Еўропы.

Суразмоўніца займалася даследаваннем Свіслачы. Можа гадзінамі расказваць пра замак былых памешчыкаў Незабытоўскіх. Дарэчы, санаторый стаіць на месцы іх сядзібы. Адзін сядзібны будынак захаваўся цалкам — зараз тут знаходзіцца лячэбна-адміністрацыйны корпус.

— Да нас прыязджаюць вельмі розныя дзеці, — кажа суразмоўніца. — Мы да кожнага ставімся з усёй душой, дапамагаем камунікаваць аднаму з адным. Наш псіхолаг актыўна працуе з тымі, у каго гэта выклікае складанасці. І дзеці з задавальненнем ўцягваюцца ў санаторныя мерапрыемствы, разнявольваюцца, адкрываюцца для зносін.

Ніна Сакава марыць пра музей пры санаторыі.

— На тэрыторыі Свіслачы тры помнікі — архітэктурны, ваенны і археалагічны , — кажа Ніна Леанідаўна. — Дзецям пра гэта трэба казаць. Гэта скарб Беларусі.

### ГАСЦЯМ ПАДАБАЕЦЦА

Дзеці ледзь паспяваюць паміж працэдурамі, заняткамі, гульнямі. Іх дзень напоўнены падзеямі.

— Я з Мінску, вучуся ў чацвёртым класе, тут упершыню, — паспявае даць справаздачу хлопчык, пакуль я фатаграфую яго з сябрам за партыяй у шашкі. Прызнаецца, што яму вельмі падабаюцца важатыя, у прыватнасці Валянціна Паўлаўна і Лідзія Дзмітрыеўна.

Яго напарнік па шашках,таксама мінчанін, дадае, што і яму ў Свіслачы хораша. Любімыя працэдуры — басейн і ванны. А яшчэ хлопцу падабаюцца блінцы, якія гатуюць у мясцовай сталовай.

Дзяўчынкі, якія гуляюць у шашкі на канапе па суседстве, падхопліваюць тэму харчавання і наперабой расказваюць, якія стравы ім падабаюцца. «Мы тут наогул не сумуем, шмат цікавых мерапрыемстваў», — хваляцца яны.

**З вялікім задавальненнем юныя адпачывальнікі наведваюць аздараўленчыя працэдуры. Усе без выключэння ў захапленні ад басейна і ваннаў. І тое, і другое на мінеральнай вадзе. Бабруйчанка Соня нават на водных працэдурах не расстаецца са сваёй сяброўкай Эміліяй з Мінску, прымаюць ванны па суседстве. Дзяўчынка прызнаецца, што спачатку крыху хацела дамоў, але, калі разнаёмілася з усімі, забылася пра свой Бабруйск. «Свіслач — лепшае месца на зямлі», — смяюцца сяброўкі.**

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



# «СЁННЯ ПАЎСТАЮ З ТАБОЮ ЎВАСКРЭСЛЫМ»

## Пасхальнае пасланне Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

Узлюбленыя ў Хрысце архіпастыры, пастыры, манахі і ўсе верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы! ХРЫСТОС УВАСКРЭС!

Са светлай радасцю звяртаю да вас гэтае спасіцельнае прывітанне. Яшчэ зусім нядаўна, у Вялікую Пятніцу, з глыбокім смуткам мы малітоўна перажывалі пахаванне цела нашага Спасіцеля ў магільную пячору і чулі плач Яго Прачыстай Маці, а ў Вялікую Суботу спявалі: «спіць Жыццё, і пекла трымціць» і з хваляваннем у сэрцы назіралі, як у храмах цёмныя рызы і ўбранні мяняліся на светлыя.

І вось наступіла святая і спасіцельная ноч, і мы спяваем: «Учора быў я пахаваны з Табою, Хрысце, — сёння паўстаю з Табою ўваскрэслым. Распяты быў я з Табою ўчора — праслаў жа мяне з Сабою Ты Сам, Спасіцелю, у Царстве Тваім».

Ужо напоўніліся нашы сэрцы доўгачаканым і невымоўным лікаваннем, ужо чуем мы ад свяшчэннаслужыцеляў і вітаем адзін аднаго спасіцельным воклічам: «Хрыстос Уваскрэс!»

Што можа параўнацца з пасхальнай радасцю, з гэтай вялікай урачыстасцю? Ці ёсць іншыя словы, якія могуць з большай глыбінёю перадаць сутнасць таго, што зрабіў Бог для чалавека, што Ён з любоўю падрыхтаваў для кожнага з нас, адкрыўшы шлях да паўнаты зносін з Богам і радасці вечнага жыцця.

Уся паўната благадаці, якую хрысціянін знаходзіць у Царкве, дзеянні Промыслу Божага, якія праяўляюцца ў нашым жыцці, прабачэнне грахоў і духоўнае адраджэнне праз таінствы Пакаяння і Еўхарыстыі, невымоўная радасць, якая даруецца нам Духам Святым — усё гэта плады Хрыстовага Уваскрасення, якія кожны з нас мае магчымасць перажываць на ўласным вопыце і бачыць сваімі духоўнымі вачыма.

«Уваскрасенне Хрыстова бачыўшы, пакланімся Святому Госпаду Іісусу», — заклікае нас Царква на пасхальных і нядзельных богаслужэннях, бо кожнае нядзельнае богаслужэнне — гэта малая Пасха. І сёння нам асабліва важна ўсвядоміць, чаму ў гэтым песнапенні гаворыцца пра тое, што мы ўжо бачылі Хрыстова Уваскрасенне, а не проста верым у яго.

На гэта адказвае нам прападобны Сімяон Новы Багаслоў: «Уваскрасенне Хрыстова адбываецца ў кожным з нас, і не аднойчы, але штогадзінна, калі Сам Уладыка Хрыстос паўстае ў нас у светлым адзенні, бліскаючы маланкамі бяссмерця і Бажаства. Бо светланоснае прышэсце Духа паказвае нам уваскрасенне Уладыкі, дакладней, дарует нам бачыць Яго Самога уваскрэслым».

Калі ж мінаюць дні Вялікага посту і святкавання Пасхі, нам часам здаецца, што мы губляем духоўную радасць і жыццё наша зноў пазбаўляецца паўнаты і асэнсаванасці. Таму і заклікае нас вялікі падзвіжнік сучаснасці архімандрыт Яфрэм Філафейскі: «Не дапусціце, каб атрыманае цяпер было развеяна ветрам, не згубіце гэтага, трымайце глыбока ў сваім сэрцы, ажыццявіце на справе, каб атрымаць карысць і спазнаць прыгажосць Царства Божага».

Як жа захаваць гэтую радасць і духоўную настроенасць? У творах святых айцоў гаворыцца, што паслушэнства — гэта самы кароткі шлях да спасення і здабыцця духоўнай радасці. І ў нашы дні яно прыносіць той самы благадатны плён. Паслушэнства ў Госпадзе свяшчэннаслужыцеляў і манахаў — свайму свяшчэннаначаллю, малодшых — старэйшым, падначаленых — начальнікам, дзяцей — бацькам, нясенне нягод, немачаў адзін аднаго — усё гэта, несумненна, стварае гармонію не толькі ў грамадскім і паўсядзённым, але і ў духоўным жыцці.

Але асабліва збавіцельна паслушэнства хрысціяніна Царкве. Бо ўсё ў ёй падпарадкавана адной мэце — выратаванню чалавека, яго паўнаце жыцця з Богам. І калі мы разам з Царквою святкуем і радуемся, смуткуем і посцімся, прасвятляемся і асвячаемся, то ніколі і нідзе не страцім таго бачання Хрыстовага Уваскрасення, пра якое нам абвяшчае пасхальнае богаслужэнне. Будзем любіць Царкву, захоўваць Ёй вернасць — і радасць Пасхі ніколі не пакіне нас!

Памятаючы пра гэта, ва ўсіх абставінах нашага жыцця пастараемся захоўваць той мір, пра які гаварыў Гасподзь у сваім настаўленні вучням: «Мір пакідаю вам, мір Мой даю вам; не так, як свет дае, Я даю вам» (Ін. 14, 27). І кожны хрысціянін на тым месцы, дзе яму Бог благаславіў працаваць і жыць, закліканы пераадольваць варожасць і разлад і несці «дух мірны», які Гасподзь дарує ўсім тым, хто жыве ў малітве і паслушэнстве Яго запаведзям.

Зноў і зноў віншую Вас, дарагія, са Светлым Хрыстовым Уваскрасеннем! Няхай кожны з нас знаходзіцца ў той радасці, якой сёння мы ўсе напоўнены, няхай гэтая радасць стане крыніцай вады жывой, якая цячэ ў жыццё вечнае і насычае ўсіх тых, хто побач з намі. Няхай благаславіць Уваскрэслы з мёртвых Гасподзь усе нашы намаганні на дабрадзеянне бліжнім і ўсёй нашай Айчыне!

Сапраўды Уваскрэс Хрыстос!

**(Поўны тэкст Паслання чытайце на сайце zviazda.by)**



# ХРЫСТУС УВАСКРОС! САПРАЎДЫ ЎВАСКРОС! СЛАЎЦЕ ЯГО ЎСЕ НАРОДЫ І ЎСЯ ЗЯМЛЯ!

## Пастырскае пасланне Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага арцыбіскупа Юзафа Станеўскага на Вялікдзень

*Анёлы ім сказалі: «Больш вам не трэба слёз,*
*Хрыстос, Збавіцель свету, З памерлых уваскрос!»*

Хрыстус уваскрос! Сапраўды ўваскрос!

Умілаваныя вернікі, дарагія браты і сёстры, усе людзі добрай волі!

Вітаю вас, мае дарагія, гэтымі словамі велікоднага заклiку, які гучыць сёння ва ўсіх каталіцкіх і праваслаўных святынях свету, бо сёння ўсе хрысціяне з надзеяй святкуюць Пасху — Вялікі Дзень у гісторыі хрысціянства і ўсяго чалавецтва.

Уваскрасенне Езуса Хрыста — самы важны цуд у гісторыі чалавецтва, фундамент хрысціянскай веры. Езус уваскрос, Месія жыве! Без гэтай упэўненасці наша вера была б беспадстаўнай. Пустая магіла, дзе Езуса паклалі, пацвярджае ўсё, што Ён раней абвяшчаў і чыніў.

Няхай гэтая радасць напоўніць нашы сэрцы і заахвоціць нас, каб мы, нягледзячы на шматлікія перашкоды, з якімі мы сутыкаемся кожны дзень, былі напоўнены пазітывам і надзеяй. Каб мы глядзелі ў будучыню з верай, надзеяй і любоўю.

Браты і сёстры. Уваскрасенне адбываецца не адзін толькі раз і не заўсёды на досвітку і зусім не тады, калі мы гэта плануем. Пан праходзіць праз зачыненыя дзверы нашых сэрцаў і выходзіць з натоўпу, з самага краю бездані, так, што ніхто не можа спыніць Яго (гл. Лк 4, 29-30). Гэта Той, хто ламае хлеб на скрыжаванні дарог, корміць нас і спакойна адыходзіць, а мы раптам адчуваем, што нашае сэрца пачынае палаць (гл. Лк 24, 13—35). Ён прамовіць нашае імя, і мы адкрыем у Яго голасе, што гэта Той, хто ведае нас, бо Езус ведае, што ёсць у чалавеку, Ён ведае ўсіх (Ян 2, 25; 20, 16).

З гэтага часу няма больш ночы і цемры. Белы колер шатаў Уваскрослага Пана закрывае ўсю чарнату зла, якая назапасілася ў гісторыі чалавецтва. Гэтая незвычайная яснасць, якую ніпто ўжо не зможа засланіць, абвяшчае будучыя часы, калі ўсе збаўленыя людзі, апранутыя ў белыя шаты, сядуць вакол трона пераможнага Ягняці і будуць валадарыць вечна з Хрыстом, паводле візіі Апакаліпсіса святога Яна.

Ёсць яшчэ адно важнае пасланне, якое сімвалізуе пастава апостала. Калі вучань убачыў пустую магілу, ён паверыў, гэта значыць зразумеў вучэнне Езуса, бо, як піша св. Ян, «яны яшчэ не ведалі Пісання, што трэба было Яму ўваскрэснуць з мёртвых» (Ян 20, 9). Вера прадугледжвае разуменне сэнсу паслання Добрай Навіны. Зямным жыццём не завяршаецца існаванне чалавека. Кожны чалавек пакліканы да жыцця вечнага. Таму ён абавязаны не толькі зразумець гэтую ісціну, але і жыць паводле яе. Адсюль заклік да клопату аб якасці нашай зямной пілігрымкі. Пасля велікоднай раніцы апосталы зноў паверылі і аддалі жыццё за Хрыста Уваскрослага. Пасхальная праўда зрабіла магчымым, каб яны захавалі гераічную вернасць Езусу. Сённяшняе свята павінна перамяніць таксама і нас. Кожны, хто святкуе ўваскрасенне Хрыста, павінен праверыць свае паводзіны. Пустая магіла становіцца заклікам: варта ахвяраваць усё дзеля Настаўніка з Назарэта, бо Ён з'яўляецца крыніцай, сэнсам і завяршэннем жыцця кожнага з нас!

Сёння, калі мы ўсклікаем: «Хрыстус уваскрос!», мы таксама слухаем адказ іншага чалавека, які з верай адкажа: «Сапраўды ўваскрос!». Гэтыя велікодныя заклік і адказ набліжаюць нас адзін да аднаго, а таксама набліжаюць да мэты, дзеля якой мы былі вызвалены з адхлані смерці. Таямніца ўваскрасення Сына Божага ахоплівае і нашае ўваскрасенне. Хрыстус не ўваскрос адзін. Разам з Ім ажывае ўсё стварэнне з чалавекам на чале. Святы Павел піша да супольнасці Каласянаў: «Калі ж вы ўваскрэслі з Хрыстом, шукайце таго, што ў вышынях, дзе Хрыстус сядзіць праваруч Бога; пра тое, што ў вышынях, думайце, а не пра зямное, бо вы памерлі, і жыццё вашае схавана з Хрыстом у Богу» (Клс 3, 1-4).

Любыя вернікі! Ахвяра на крыжы, уваскрасенне і ўнебаўшэсце складаюць дасканалы план збаўлення кожнага чалавека. Толькі Бог можа прапанаваць чалавеку такі цудоўны і міласэрны шлях. Таму мы таксама ўваскрэснем «і ўжо не будзе ні смерці, ні смутку, ні плачу, ні болю ўжо не будзе» (Ап 21, 4). А да чаго мы ўваскрэснем? Мы ўваскрэснем насустрач усеабдымнай любові. «Бо Валадарства Божае — гэта не ежа і піццё, але справядлівасць, спакой і радасць у Духу Святым» (Рым 14, 17). Ты верыш, што мы ўваскрэснем? Калі верыш, то падзяліся сваёй верай і надзеяй з іншымі.

Дарагія браты і сёстры! Няхай радаснае і ўзнёслае «Аллелюя» гучыць у нашых сэрцах.

*Слёзы з твару выцірайце, праганяйце з сэрцаў грэх.*
*Песні радасна спявайце, хай гучыць вясёлы смех.*
*Уваскрос Пан над Панамі, Ён жыве, Ён разам з намі.*

**(Поўны тэкст Паслання чытайце на сайце zviazda.by)**

# КАЛІ ЖЫЦЬ З БОГАМ, ТО СТРАХІ ЗНІКАЮЦЬ

## Пераканана маці шасцярых дзяцей, жонка настаяцеля прыхода храма свяціцеля Мікалая Цудатворца ў Лагойску Уладзіміра Шэйдака, жанчына года—2024 у намінацыі «Духоўнасць і культура» Інга Шэйдак

### САМЫ ГАЛОЎНЫ ПРАЕКТ

Мы сядзім з матушкай Інгай у вялікай і ўтульнай кватэры, дзе адчуваецца дастатак і наладжаны побыт. Іконы нагадваюць, што я — у доме святара. Сёння тут жыве шасцёра чалавек. Бацька, маці, трое дачок: Марыя, Аляксандра, Анастасія і малодшы сын Мікалай. Двое старэйшых — 31-гадовы Данііл і 26-гадовы Сава — ужо вылецелі з бацькоўскага гнязда.

— Дружная сям'я — мой галоўны праект у жыцці, — прызнаецца Інга Іванаўна. — Сама я — адзіная дачка. Бацькі былі ў разводзе, і мне гэта не падабалася. Заўсёды марыла выйсці замуж раз і назаўсёды, мець як мінімум дваіх дзяцей.

З Уладзімірам Шэйдакам Інга пазнаёмілася ў сяброў. І паводле яе слоў, адразу адчула сябе з ім камфортна, спакойна, надзейна. Ужо праз чатыры месяцы малады чалавек зрабіў дзяўчыне прапанову, і неўзабаве Уладзімір і Інга пажаніліся. Праз год нарадзіўся першынец Данііл.

— Пра наша жыццё можна сказаць так: мы рухаліся спачатку ў адным напрамку, а потым усё змянілася, і пайшлі ў іншым, — распавядае матушка Інга. — Муж працаваў начальнікам транспартнага аддзела аднаго з камерцыйных банкаў, я — бухгалтарам, потым эканамістам. Плюс у нас з'явіўся свой бізнес. Усё складалася ўдала. Але ў Госпада ў адносінах да нас была іншая задума.

Аб духоўных з'явах складана казаць свецкай мовай. Па факце «паварот» да новага жыцця здарыўся ў Лагойску, дзе маладая маці праводзіла лета з маленькім Даніілам. Гуляючы з дзіцем, яна часта брала ваду са святой крыніцы, у вольны час заглядвала ў царкву свяціцеля Мікалая. У выхадныя да сям'і з Мінску прыязджаў Уладзімір. Неяк настаяцель храма, таксама айцец Уладзімір, які прыкмеціў маладую пару, запрасіў іх спяваць на кліpace.

Не прайшло і года, як ён прадставіў Уладзіміра Шэйдака мітрапаліту Філарэту, з якім адбылася грунтоўная размова. Гэта было напярэдадні Вялікага посту, у Даравальную нядзелю. На другі дзень Вялікадня Уладыка Філарэт пасвяціў айца Уладзіміра ў дыяканы і неўзабаве — у святары.

А праз паўтара гады ў пары нарадзіўся доўгачаканы другі сын — Сава.

— У пачатку новага шляху ўсе цяжкасці пераносіліся лёгка, мы нібы лёталі на крылах, — успамінае матушка Інга. — Але прайшлі і праз сваё «чысцілішча», калі многія ад нас адвярнуліся, матэрыяльна даводзілася няпроста. Гэта таксама было патрэбна. Мы праявілі стойкасць і зацвердзіліся ў сваёй веры.

***— Каб падняць шасцярых дзяцей, патрэбны немалыя сродкі. Ці не было ў вас страхаў, ці справіцеся, ці па сілах мужу ўтрымліваць такую вялікую сям'ю?***

— Калі жыць з Богам, то страхі знікаюць. Мы з мужам верылі: калі Гасподзь дае нам дзяцей, то дасць і на іх. З нараджэннем кожнага дзіцяці наш дабрабыт паляпшаўся.



Фінансавае забеспячэнне сям'і поўнасцю ўзяў на сябе айцец Уладзімір. Ён жа заўсёды ажыццяўляў сувязь сям'і з навакольным светам. А Інга займалася дзецьмі, побытам.

— Я задаволена тым, што прысвяціла сябе не прафесіі, а выхаванню дзяцей, — дзеліцца Інга Іванаўна. — Мы з мужам клапаціліся аб тым, каб не толькі пракарміць і апрануць іх, але і даць добрую адукацыю, далучыць да заняткаў спортам, музыкай, прывіць тыя каштоўнасці, якія лічылі вельмі важнымі. Гэта каласальная праца! Але яна таго варта — вынік мяне цешыць.

Усе шасцёра дзяцей вучыліся ў гімназіі № 13 (Мікалай яе сёлета заканчвае). Данііл і Марыя — праграмісты, Сава — урач-хірург, Аляксандра — студэнтка БДМУ, а Анастасія — мехмата БДУ. Усе шасцёра займаліся музыкай. Сава і Мікалай — майстры спорту па аўтаспорце, Данііл — кандыдат у майстры, Аляксандра — кандыдат у майстры спорту па сучасным пяцібор'і.

— Мы з мужам не прытрымліваліся нейкіх сістэм выхавання, на кожным этапе дзейнічалі так, як лічылі найлепшым для дзяцей, — прызнаецца матушка Інга. — Заўсёды старалася дапамагаць сынам і дочкам у дасягненні іх мэт. Мы давяралі дзецям, шмат што дазвалялі, але ў некаторых пытаннях ніколі не прагіналіся пад іх. Напрыклад, не дазвалялі начаваць па-за домам. Няпроста было прывучыць да дысцыпліны. Аднак праявілі настойлівасць, і ўсім спатрэбілася здольнасць рабіць часам тое, чаго не хочацца.

Пакуль дзеці раслі, усе выхадныя, водпускі сям'я старалася праводзіць разам. Сёння ім складана часам сабрацца, але пры любой магчымасці — на дні нараджэння, рэлігійныя і свецкія святы, у якасці ўдзельнікаў і балельшчыкаў спартыўных спаборніцтваў — яны імкнуцца гэта рабіць. І вядома, у сям'і Шэйдакаў надзённае запатрабаванне для кожнага — наведваць па нядзелях храм, удзельнічаць у дабрачыннасці.

### СУЖЭНСКІЯ СУСТРЭЧЫ

Вось ужо 8 гадоў па благаславенні мітрапаліта Веніяміна айцец Уладзімір і матушка Інга як валанцёры займаюцца дабрачынным праектам «Сужэнскія сустрэчы». Мэта гэтага міжнароднага міжцаркоўнага руху з больш чым 70-гадовай гісторыяй — запрасіць да размовы пары, якія хочуць палепшыць, гарманізаваць, абнавіць адносіны.

Гэта своеасаблівая школа асваення навыкаў дыялога, дзе вучацца абмяркоўваць і вырашаць праблемы, якія ўзнікаюць у шлюбе, пераадольваць канфлікты і крызісы, ставіць мэты і вызначаць шляхі іх дасягнення. Рэгулярныя штомесячныя сустрэчы, па словах маёй суразмоўніцы, «разаграваюць» у партнёрах жаданне ўдасканальваць адносіны.

— Канфлікты ў сям'і — гэта нармальна, — лічыць матушка Інга. — У нас з Уладзімірам яны таксама ёсць, але мы навучыліся іх правільна ацэньваць, абмяркоўваць, выходзіць з іх і пакідаць у мінулым. Іх пераадоленне — гэта натуральны рост кахання. Так мы пачынаем прымаць блізкага чалавека з яго недахопамі, памылкамі, шанаваць ужо за тое, што ён ёсць.

Для Уладзіміра і Інгі Шэйдакаў эфект «Сужэнскіх сустрэч» відавочны. Пары з невялікім стажам сумеснага жыцця «купіруюць» нейкія непаразуменні на старце. Муж і жонка, якія думалі развесціся, часта адмаўляюцца ад гэтага кроку. Часам на гэтых сустрэчах мужчыны і жанчыны ўпершыню адчуваюць смак духоўнага жыцця.

— Каханне — гэта выбар, рашэнне, пазіцыя, — пераканана матушка Інга. — Мы робім выбар, прымаем рашэнне і займаем пазіцыю. Сям'я, дзеці — дар Божы, скарб, дзеля захавання якога варта працаваць над адносінамі і над самім сабой, шукаць выйсце з праблемных сітуацый, вучыцца ставіць высокія мэты і верыць: усё магчыма.

***— Як адзначаеце Вялікдзень?***

— У нашай сям'і асаблівае значэнне надаюць перадвелікоднаму тыдню, апошняму тыдню посту, які ў грэчаскай традыцыі называецца Стаўрас (Крыжовы) Вялікдзень, унутранай, духоўнай падрыхтоўцы да свята Светлага Хрыстовага Уваскрэсення. Набажэнствы на працягу ўсяго тыдня вельмі своеасаблівыя (служацца толькі раз на год), напоўнены выключнай глыбінёй і сэнсамі. Таму кожны з сямі дзён называецца Вялікім — па велічыні і значнасці перажываных Царквой на працягу тыдня падзей. Як і ўсе, пячэм кулічы, фарбуем яйкі, рыхтуем тварожную пасху. Увечары ў суботу разам ідзем на Усяночнае дбанне з хросным ходам вакол храма, Літургіяй і прычасцем. У Велікодны дзень наведваем канцэрт Нядзельнай школы, які па традыцыі праходзіць у Лагойскім старажытным парку Тышкевічаў.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД**
**і прадастаўлена суразмоўніцай.**

СПАДЧЫНА

# ФРАГМЕНТЫ З ГІСТОРЫЯЙ

## Аднoўленыя мармуровыя надмагіллі з Гальшанскага касцёла прадстаўлены ў новай экспазіцыі

Гісторыя ці не для кожнага — гэта найперш школьныя ўрокі, дзякуючы якім прыходзіла разуменне пра жыццё народаў у часе. А ўрокі жыцця даюцца кожнаму для таго, каб папоўніць гісторыю свайго роду годнымі справамі, вартымі памяці нашых продкаў. Пра гэта думалася пасля размовы з мастацтвазнаўцам Барысам Лазукам: у Беларусі ёсць на што звярнуць увагу, а то і перагледзець свае ўласныя адносіны да рэчаў, якія могуць захоўвацца ў сям'і з часоў сівой даўніны...



— У Навукова-даследчым музеі беларускага мастацтва і культуры (гэта новая назва вядомага раней Музея старажытнабеларускай культуры) вялікая калекцыя — больш за 35 тысяч адзінак захоўвання з архівамі. Да 46-й гадавіны існавання музея правялі рэканструкцыю экспазіцый, залы набылі новы выгляд. Але мы расставілі іншыя акцэнты ў дэманстрацыі прадметаў. Таму што ў нас самая вялікая ў рэспубліцы калекцыя абразоў, алтарнай і дэкаратыўнай разьбы, скульптуры. Мадэрнізацыю перажылі залы, дзе прадстаўлены сакральныя калекцыі, асобныя рэкрэацыі — праваслаўнай і каталіцкай канфесій. У спецыяльных вітрынах пад адмысловай аховай выстаўлены два арыгіналы слуцкіх паясоў, якія захоўваюцца ў нашым музеі, — гаворыць Барыс Лазука.

Была зроблена рэканструкцыя надмагілля Сапегаў. Скульптурныя пліты надмагілля прывезены з Гальшанскага касцёла. Гэта знакамітае надмагілле Сапегаў было сфарміравана да 1635 года (дата смерці Паўла Стэфана Сапегі, апошняга вядомага ўладара Гальшанскага замка). Чатыры мармуровыя пліты знаходзіліся ў мясцовым касцёле, але моцна пацярпелі ад рук вандалаў. Напрыканцы 1980-х пліты ўдалося прывезці ў музей, дзе іх паклалі так, як у Гальшанах. Першапачатковае палажэнне магло быць іншым, прынамсі, як у надмагіллі Льва Сапегі ў Вільні — там эфігія (надмагілле) прысвечана яму і дзвюм яго жонкам. Павел Стэфан Сапега быў жанаты чатыры разы. Тры памерлыя жонкі былі пахаваны ў Гальшанах. У касцёле стварылі мемарыяльную кампазіцыю, якая прадстаўляе членаў кодэнскай галіны рода Сапегаў. Гэта была не толькі партрэтная выява, але выява чалавека ў своеасаблівым стане — вечнага сну, які перарвецца падчас Страшнага суду, каб паўстаць перад Богам. Гэта мемарыяльна-памятная канструкцыя прайшла праз рэстаўрацыю і прадстаўлена ў музеі ў новым варыянце.

Быў час, калі хваля вандалізму ахапіла рэгіёны (Караткевіч красамоўна апісвае гэта ў «Чорным замку Альшанскім»). Вучоныя ў 80-я — 90-я гады ездзілі па Беларусі і бачылі катастрофу, нешта падбіралі, прывозілі. Так паступалі і нераўнадушныя людзі, мастакі, якія наведвалі Гальшаны. Да пэўнага моманту знаходкі яны захоўвалі ў сябе, а некалькі гадоў таму мінскія мастакі зрабілі музею грандыёзны падарунак: абломкі гэтых скульптур. Частку з іх вучоныя ідэнтыфікавалі і ўключылі ў кампазіцыю надмагілля. Напрыклад, цалкам аднавілі руку адной з жонак, частку твару другой жонкі. Але ёсць асобныя дробныя фрагменты, першапачатковае месцазнаходжанне якіх цяжка вызначыць. Барыс Андрэевіч, які быў аўтарам рэканструкцыі надмагілля, мяркуе, што з развіццём камп'ютарных тэхналогій і штучнага інтэлекту цягам часу змогуць вырашыць гэтую задачу.

— Адказнасць можа будавацца на двух падыходах. Паколькі ў аснове нашай культуры — хрысціянскае вучэнне, то першы — гэта страх, што Усявышні пакарае за грахі. Другі — заснаваны на дабрыні і разуменні сваёй місіі цывілізаванага чалавека, асэнсавання свайго месца ў свеце, — адзначае Барыс Андрэевіч. — У гэтым сэнсе адносіны да нашай спадчыны павінны трымацца не толькі на пакаранні: калі ты пашкодзіў аб'ект, які знаходзіцца пад аховай дзяржавы, то згодна з законам будзеш пакараны. Незаконна зрабіў раскопкі — таксама. І гэтак далей. Але часам мы губляем каштоўныя рэчы з-за таго, што, на жаль, многія людзі недасведчаныя ў гэтай тэме. Мы часам не звяртаем увагі на тое, што знаходзіцца ў нас дома... Таму падчас сустрэч з моладдзю я часта спытваю: «Якое імя было ў вашай бабулі па лініі маці? А ў дзядулі па лініі бацькі?», «А як звалі прабабулю?..» — тут ужо пачынаюцца цяжкасці. Але з асобных людзей складаецца народ, а для яго страта гістарычнай памяці — небяспечная з'ява. Добра, што зараз мы аднаўляем некаторыя прабелы: «Год гістарычнай памяці», «Год малой радзімы»... Гэта складнікі дзяржаўнай палітыкі ў гэтым кірунку. А музеі даюць магчымасць захаваць нашу памяць праз рэчы, якія дапамагаюць ажывіць гісторыю ў нашым уяўленні.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## О реализации имущества СООО «МЯСОПРОДУКТ»

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Индивидуальный предприниматель Бучацкий Никита Игоревич, УНП 193189351, г. Минск, ул. Мирошниченко, д. 21, кв. 4, тел. +375 29 712 68 54 |
| **Продавец** | СООО «МЯСОПРОДУКТ», УНП 800016744, тел. +375333070212 |
| **Форма, дата, время и место проведения торгов** | Торги в форме открытого аукциона **19.05.2025 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. П. Румянцева, д. 17-1Н, каб. 2 |

**Сведения о предмете проведения торгов**

**Лот № 1 (все одним лотом):**
- капитальное строение (наименование – Здание мясоколбасного цеха) с инвентарным номером 622/С-20986, состоящее из недвижимых улучшений (здание мясоколбасного цеха А1/п с пристройками 1-12,22,23,25,26,28-30, холодильными камерами 13-18, навесами 19,24,27, складом № 1 20, складом № 2 21, крыльцами б и в, дымовой трубой а) общей площадью здания 1596,1 м², расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625481704116000002, по адресу: Минская область, Столбцовский район, Старосверженский с/с, 6, район д. Скоморошки;
- капитальное строение (наименование – Здание группы оформления документов) с инвентарным номером 622/С-40413, состоящее из недвижимых улучшений (Здание группы оформления документов В1/м с пристройкой 1 и крыльцом) общей площадью здания 36,8 м², расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625481704116000002, по адресу: Минская область, Столбцовский район, Старосверженский с/с, д. Скоморошки, ул. Восточная, 15/2;
- капитальное строение (наименование – Здание КПП) с инвентарным номером 622/С-40412, состоящее из недвижимых улучшений (Здание КПП В1/д с пристройкой 1 и дымовой трубой) общей площадью здания 29,6 м², расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625481704116000002, по адресу: Минская область, Столбцовский район, Старосверженский с/с, д. Скоморошки, ул. Восточная, 15/1;
- дороги асфальтобетонные;
- навес-ограждение дезбарьера;
- забор-ограждение по периметру территории предприятия;
- производственное оборудование и инвентарь согласно списку, размещенному на сайте: Likvidtrade.by

**Сведения о земельном участке:**
**- земельный участок с кадастровым номером 625481704116000002, площадь – 0,9851га, назначение – обслуживание выкупленных зданий и сооружений, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования.**
По вопросу ознакомления с предметом торгов, дополнительной информации обращаться по моб. тел. +375 29 712 68 54

**Начальная цена предмета торгов:**
Лот № 1 – **895974,07** долларов США с НДС по ставке 20 %.
Валюта платежа: белорусский рубль с применением курса Национального банка Республики Беларусь на дату платежа.
**Местонахождение предмета торгов:** Минская область, Столбцовский район, Старосверженский с/с, д. Скоморошки, ул. Восточная, 15/1, 15/2

**Порядок проведения торгов**

Шаг аукциона – 5 %. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявки на участие в них только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Размер задатка, сроки приема заявлений и порядок зачисления задатка**

Задаток в сумме 10 % от стоимости предмета торгов перечисляется в срок по 16.05.2025 на р/с BY68 ALFA 3013 2431 4400 1027 0000 в г. Минск ЗАО «Альфа-Банк», БИК ALFABY2X, получатель – Индивидуальный предприниматель Бучацкий Никита Игоревич, УНП193189351, назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Валюта платежа: белорусский рубль с применением курса Национального банка Республики Беларусь на дату платежа.
Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в торгах.
Прием заявлений с приложением документов осуществляется с 09.00 21.04.2025 по 18.00 16.05.2025 заказной корреспонденцией по адресу: индивидуального предпринимателя Бучацкого Никиты Игоревича (220131, г. Минск, ул. Мирошниченко, 21-4) либо по e-mail: n.buchatski@gmail.com
**Совместно с заявлением на участие в торгах предоставляется:**
**Юридическими лицами – резидентам Республики Беларусь** – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники, доверенность представителя юридического лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица.
**Юридическим лицом, иной организацией – нерезидентом Республики Беларусь** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
**Индивидуальным предпринимателем** – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона.
**Индивидуальным предпринимателем – нерезидентом Республики Беларусь** – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
**Представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь** – нотариально удостоверенная доверенность;
**Представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя** – нерезидента Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов

**Срок подписания договора и срок оплаты приобретенного предмета торгов:**
Срок подписания договора – 10 банковских дня с момента утверждения протокола об итогах торгов.
Срок оплаты приобретенного предмета торгов – 3 банковских дня от даты заключения договора

| | |
|---|---|
| **Возмещение затрат** | Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, а также оплатить вознаграждение Организатору торгов в размере 1,5 % от окончательной цены продажи предмета торгов, в течение 3 банковских дня со дня проведения торгов |
| **Документы, необходимые для участия в торгах** | Заявка на участие в торгах, платежный документ о перечислении задатка; документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах |


# РАЗАМ

# І ДРЭВА ПАСАДЗІЦЬ, І КАНТЭНТ ЗНЯЦЬ

## Блогеры і актыўныя медыяперсоны ўзялі ўдзел у высадцы дрэў на тэрыторыі будучага Парку народнага адзінства

Учора на пляцоўцы будучага Парку народнага адзінства папулярныя блогеры і актыўныя лідары меркаванняў узялі ўдзел у працоўнай акцыі на карысць добраўпарадкавання сталіцы. Карэспандэнт «Звязды» далучылася да мерапрыемства і даведалася падрабязнасці.





Спачатку стваральнікам віртуальнага кантэнту расказалі пра будаўніцтва Нацыянальнага гістарычнага музея, які размесціцца ў так званым Квартале беларускай дзяржаўнасці — побач з будынкамі Палаца Незалежнасці, Вярхоўнага Суда, плошчай Дзяржаўнага сцяга, пасля правялі неабходны інструктаж. Добраўпарадкаванне само па сабе — справа важная і карысная, а калі за яе бяруцца блогеры, час увогуле ляціць незаўважна.

